Пролетарыі усіх краёў, злучайцеся!

# Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 70 к. „ 3 „ — 2 р. — к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 7 р. — к. Зьмена адрасу: ішчагародняя—20 к. месцовая — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапцэрэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапцэрэлі насьпрэд тэксту 1 р. — к. За радок шапцэрэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвешныя на 50 проц. дарожэй. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8-ы ГОД ВЫДАЧЫ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 231 (2123) Аўторак, 11-га кастрычніка 1927 г.

## Усесаюзны зьезд работніц і сялянак.

(Артыкул Старшыні ЦВК СССР тав. М. І. КАЛІНІНА).

10-га кастрычніка ў Маскве адчыніўся ўсесаюзны зьезд работніц і сялянак.

Я лічу гэты зьезд вялікай грамадзкай падзеяй ня толькі для працоўных нашае краіны, але і для працоўных жанчын усяго сьвету.

Усесаюзны зьезд работніц і сялянак пасьлужыць пераломным момантам ва ўсёй працы савецкіх і грамадзкіх арганізацый, узмацніць увагу да патрэб і запытаў работніц і сялянак з боку саветаў.

Савецкія арганізацыі ад нізу да верху павінны раз на заўсёды запамятаць, што сацыялістычнае будаўніцтва немагчыма без актыўнага ўдзелу працоўных жанчын. Савецкія арганізацыі і шырокія працоўныя масы, асабліва сялянства, павінны канчаткова зьнішчыць нядбайныя адносіны, якія яшчэ да гэтага часу наглядаюцца, да ўцягненьня і вылучэньня работніц і сялянак на практычную працу саветаў.

Кожны савет павінен абмеркаваць і ўжыць канкрэтныя меры да сапраўднага ўцягненьня ўсіх выбраных работніц і сялянак у практычную працу, улічваючы пры гэтым інтарэсы і імкненьне саміх працоўных жанчын да тае ці іншае працы.

Ад арганізатараў савецкага апарату патрабуецца ўменьне знайсьці канкрэтную і цікавячую працу для прыцягваемых. Ад удалага вырашэньня гэтых задач залежыць посьпех сацыялістычнага будаўніцтва.

Каб падрыхтаваць з работніц і сялянак сапраўдных будаўнікоў сацыялістычнае грамады, савецкія арганізацыі павінны сыстэматычна кіраваць практычнай працай выбарных работніц і сялянак і навучыць іх выконваць ня толькі другарадную працу ў саветах, але і быць кіраўнікамі яе. Саветы, дапамагаючы дэпутаткам выканаць практычную працу, будуць ствараць аўтарытэт для іх сярод працоўнага насельніцтва.

На дзесятым годзе рэвалюцыі мы павінны цьвёрда сказаць, што савецкія і грамадзкія арганізацыі павінны больш моўна выканаць заветы Ільліча і сапраўды навучыць работніц і сялянак кіраваць дзяржаваю і быць кіраўнікамі ня толькі саветаў і валвыканкомаў на пізох, але і павятовых і губэрскіх арганізацый.

Безумоўна, за 10 гадоў існаваньня ўлады саветаў працоўная жанчына значна прасунулася наперад да сапраўднага параўнаньня ў правох з мужчынай. Няма ні аднае галіны сацыялістычнага будаўніцтва, дзе-б не павялічыўся ўдзел працоўных жанчын у працы. **Кожныя перавыбары саветаў сыстэматычна, няўхільна павялічваюць колькасьць і процант жанчын у саветах.**

Гэта бязумоўна вядзе да павышэньня ролі жанчын ва ўсіх органах кіраваньня краінай. Можна прасачыць крок за крокам прасоўваньне шэрагу работніц і сялянак з нізавых савецкіх арганізацый у вышэйстаячыя.

Многія савецкія арганізацыі ўжо добра ўявілі, што нельга ажывіць працу саветаў і іх сэкцый, нельга перабудаваць жыцьцё пановаму без актыўнага ўдзелу працоўных жанчын і ў першую чаргу бяз выбарнага іх актыву, зьвязанага з шырокай масай.

Савецкія арганізацыі павінны ўжыць усе меры, каб вылучэньні з работніц і сялянак ня трацілі сувязі з шырокімі жаночымі масамі, каб, выконваючы тыя ці іншыя службовыя абавязкі, яны чула выяўлялі патрэбы працоўных жанчын. Толькі пры гэтых умовах ня толькі работніцы і сялянкі, але і шырокія масы рабочых і сялян будуць бачыць у іх сапраўдных прадстаўнікоў.

Надыходзячы зьезд будзе зьездам работніц і сялян, абраных у саветы ад усіх ступеняў нашае савецкае сыстэмы. Бязумоўна, што ён будзе выявіцелем думкі ня толькі савецкага жаночага актыву, але і шырокіх працоўных мас. **Усесаюзны зьезд павінен ускалыхнуць, узьняць на мясцох шырокія масы працоўных жанчын і яшчэ шырэй уцягнуць іх у савецкае грамадзкае будаўніцтва.**

Шырокія рабоча-сялянскія масы павінны ўявіць, які вялікі ганаровы абавязак ляжыць на іх прадстаўнікох на зьезьдзе і павінны, на звароце іх са зьезду, заслухаць справаздачы.

Каштоўнасьць пастаноў зьезду будзе ў шмат чым залежаць ад таго, наколькі яго дэлегаткі здолеюць выявіць найбольш вострыя моманты сваёй працы, адзначаць тыя ўмовы, якія ўцяжаюць прыцягненьне жанчын ў вытворчасьць і кіраваньне краінай і намецяць канкрэтныя шляхі для перамогі дяжкасьцяў і ў цэнтры і на мясцох. Усесаюзны зьезд работніц і сялянак і падрыхтоўчыя зьезды і канфэрэнцыі на мясцох не павінны замаскоўваць пытаньняў, цікавячых работніц і сялянак, бо на глебе задаволеньня патрэб і запытаў работніц і сялянак хутчэй пойдзе арганізацыя працоўных жанчын навакол саветаў.

Гэту ўвагу ня трэба паслабляць і ў далейшым. Усесаюзны зьезд паслужыць пачаткам і пераломным момантам пават у такіх савецкіх і грамадзкіх арганізацыях і сярод працоўных мас, дзе да гэтае пары вважнасьць удзелу працоўнай жанчыны ў сацыялістычным будаўніцтве, перабудове гаспадаркі і быту яшчэ ня была ўлічана. Усесаюзны зьезд і яго падрыхтоўка будуць уступам да вялікіх дзён Кастрычніка і да выбараў саветаў.

Зьезд і яго падрыхтоўка на мясцох згуртуўвае ўвагу шырокіх працоўных мас на пытаньнях ня толькі ўцягненьня жанчын у савецкае будаўніцтва, але і ў справу абароны краіны.

Больш складаныя міжнародныя абставіны патрабуюць найбольшага аб'яднаньня работніц і сялянак навакол саветаў, мабілізацыі іх сіл для абароны краіны. Падрыхтоўка працоўных жанчын да абароны краіны складаецца ня толькі з узмоцненай падрыхтоўкі да замены мужчын на фабрыцы і ў сельскай гаспадарцы. Кожны працоўны, і асабліва актыў работніц і сялянак праз зьезд і яго падрыхтоўку на мясцох павінен уявіць вялікія словы Леніна, што «пралетарскія жанчыны ня будуць глядзець пасыўна, як добра ўзброеная буржуазея будзе растрэльваць кепска ўзброеных, ці зусім ня ўзброеных рабочых: яны возьмуцца за зброю».

Значэньне ўсесаюзнага зьезду і зьездаў, правадзімых на мясцох перад дзесятай гадавінай Кастрычнікавае рэвалюцыі, вялізнае. Але зьезды могуць даць пажаданыя вынікі толькі пры ўмовах, калі ўвага шырокіх мас рабочых і работніц, сялян і сялянак будзе згуртавана на пытаньнях зьезду.

Пажадаем-жа поўнага посьпеху ўсесаюзнаму зьезду работніц і сялянак членам саветаў!

## Супроцьсавецкі згавор у Парыжы.

### ЧЭМБЭРЛЕН СХІЛЯЕ БРЫЯНА І ЗАЛЕСКАГА ЗАСНАВАЦЬ АДЗІНЫ ФРОНТ ПРОЦІ СССР.

### Ураду СССР паслана нота аб адкліку Ракоўскага

### ФРАНЦУСКАЯ НОТА АБ АДАЗВАНЬНІ РАКОЎСКАГА.

ПАРЫЖ, 8-Х. Друк падае весткі з афіцыйных крыніц, згодна якіх учора з Парыжу ў Маскву Эрбэту паслана нота для перадачы Чычэрыну. Нота, водлуг слоў друку, зьмяшчае фармальнае патрабаваньне адкліку Ракоўскага, прычым проці Ракоўскага, апроч вядомага абвінавачаньня ў дачы подпісу пад дэкларацыяй апазіцыі, высоўваецца абвінавачаньне, што ён перадаў апошнія савецкія прапановы ў прэсу без паведамленьня міністэрства замежных спраў. Факт гэты тлумачыцца, як зварот да грамадзкае думкі Францыі і, значыцца, як некарэктнасьць.

### ПАРЫСКІ ПАДКОП СУПРОЦЬ СССР.

### Спатканьне Брыяна з Чэмбэрленам і Залескім.

ПАРЫЖ, 8-Х. „Эко дэ Пары" заявляе, што абвастрэньне франка-савецкіх дачыненьняў наогул не закранулася ў гутарцы Чэмбэрлена з Брыянам.

Наадварот, „Пці Парызьен" паведамляе, што Чэмбэрлен на запытаньне аб гэтым супрацоўніка газэты адказаў; „Не задавайце мне такіх недалікатных запытаньняў".

У афіцыйным паведамленьні міністэрства замежных спраў зазначана, што абодвы міністры, абмяняўшыся думкамі па пытаньнях, у якіх зацікаўлены зараз Англія і Францыя, сьцьвердзілі адналкавасьць сэаіх поглядаў.

„Пары Матыналь" і „Популер" заявляюць, што ПЫТАНЬНЕ АБ АДНОСІНАХ ФРАНЦЫІ, АНГЛІІ І ПОЛЬШЧЫ ДА СССР БУДЗЕ СУР'ЁЗНА АБМЯРКОЎВАЦЦА МІЖ БРЫЯНАМ, ЧЭМБЭРЛЕНАМ І ЗАЛЕСКІМ. „Пары Матыналь" пра гэта піша: „Мы ня можам заварацць, што процісавецкі блёк будзе ўтворан у бліжэйшыя дні, але лічым патрэбным падкрэсьліць АДНАЧАСНАСЬЦЬ ПРЫСУТНАСЬЦІ Ў ПАРЫЖЫ ЧЭМБЭРЛЕНА І ЗАЛЕСКАГА.

„Юманіта" піша, што Чэмбэрлен і Брыян будуць разглядаць план абкружэньня СССР і, у асобку, спосабы схіліць Залескага адмовіцца ад утварэньня з Масквою ўгавору аб ненападзе.

### За Чэмбэрленам і Чэрчыль...

БЭРЛІН, 8-Х. З Парыжу паведамляюць, што ўчора ўвечары сюды начакана прыехаў таемна Чэрчыль. Яго прыезд мае сувязь з паваротным момантам у франка-савецкіх адносінах і, у асобку, з пытаньнем аб даўгох.

### Проці ўраду Пуанкарэ—вайны.

Маніфэст французкае кампартыі.

ПАРЫЖ, 8-Х. Кампартыя агаласіла маніфэст пад загалоўкам: „Прэч зьэкцыйны ўрад Пуанкарэ-Эрыё". У маніфэсьце зазначаецца, што палітыка ўраду накіравана проці рабочае клясы. Урад нападае на СССР і правануе вайну, па прыкладзе ангельскіх імпэрыялістаў. Маніфэст зазначае, што ў зьвязку з 10-мі ўгодкамі Кастрычнікавае рэвалюцыі, вялічэзныя масы будуць дэманстраваць за абарону Савецкага Саюзу.

### Рэвалюцыйная дэманстрацыя ў Сэнтуане.

ПАРЫЖ, 8-Х. Французкая кампартыя, унітарная канфэдэрацыя працы, рэвалюцыйная асацыяцыя ранейшых удзельнікаў вайны, Межрабпом і камсамол агаласілі заяву, у якой паведамляюць, што з прычыны забароны французкім урадам розных дэманстрацый у Парыжы, памянёныя арганізацыі, супольна з камітэтам Сако і Ванцэці, арганізоўваюць у нядзелю ў Сэнтуане (ваколіца Парыжу) працэсію памяці Сако і Ванцэці з маскамі, зьнятымі з абодвых пакараных сьмерцю рэвалюцыянэраў.

Памянёныя арганізацыі заклікаюць працоўных узяць удзел у дэманстрацыі за амністыю ў Францыі і ў абарону СССР.

### К-т дробных трымацеляў —ЗА ПРАПАНОВЫ СССР.

ПАРЫЖ, 8-Х. Часовы камітэт абароны правоў дробных трымацеляў расейскіх царскіх папераў, які ў сучасны момант знаходзіцца яшчэ ў стадыі свае арганізацыі, зьвярнуўся да дэ-Моцзі з лістам наступнага зьместу:

«Выказваючы падзяку дэ-Монзі і Ракоўскаму за сэмаахвярнасьць і такт, выяўленыя імі ў часе перамоў, камітэт, дзейнічаючы ў перакананьні, што ён выказвае пункт гледжаньня паўгара мілёну дробных трымацеляў, з расчараваньнем сьцьвярджае, што ў момант, калі дробныя трымацелі разьлічвалі ўжо атрымаць першы штогодны ўзнос, зломанараныя інтрыгі перашкодзілі падпісаньню згоды. Адъезд Ракоўскага будзе зазначаць, што перамовы пахаваны, магчыма, што загінулі апошнія надзеі, бо становішча дробных трымацеляў, ужо зьбяднеўшых ад зьніжэньня франка, зьяўляецца вельмі цяжкім. Гэта яны лічаць, што франка-савецкая канфэрэнцыя дасягла вельмі каштоўных вынікаў, зрабіўшы расейскія паперы на 50 проц. больш выгаднымі для разьлікаваньня капіталу, чымся французкая рэнта. Дробныя трымацелі заявяраюць, што Нуляпс, дзейнічаючы ад кучкі спэкулянтаў, купіў валіную колькасьць расейскіх папер і карыстаецца гэтым у сучасны момант, каб шантажыраваць СССР. З гэтае прычыны дробныя трымацелі забараняюць Нуляпсу выступаць ад іх імя. Дробныя трымацелі выказваюць пажаданьні, каб згода, дасягнутая на франка-савецкай канфэрэнцыі, была зацьверджана і каб, такім чынам, ужо ў працягу сучаснае зімы можна было падаць купоны да аплаты".

Камітэт зварочвае ўвагу ўраду на тую адказнасьць, якая ўскладаецца на яго, калі ён наранейшаму будзе адносіцца з пагардаю да жыцьцёвых і арэсаў больш чымся міліёну французкіх грамадзян і прыносіць у ахвяру іх інтарэсы.

### Удар па дробных трымацелях.

ПАРЫЖ, 8-Х. Адзначаючы закулісны ўплыў Англіі на абвастрэньне франка-савецкіх адносін і абвінавачаньні, высунутыя французкім міністэрствам замежных спраў проці Ракоўскага ў зьвязку з агалашэньнем прапаноў для ўрэгуляваньня даўгоў, «Юманітэ» піша: „Удар французкага ўраду б'е непасрэдна па дробных трымацелях пазык, якія пачынаюць выяўляць непакой і арганізуюць адпор злачынным махінацыям».

## „ВЫСОКАСТАУЛЕНЫЯ" ГОСЬЦІ У ВІЛЬНІ.

ВАРШАВА, 8-Х. Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што 8-га кастрычніка Пілсудзкі выехаў ў Вільню разам з міністрам асьветы Дабруцкім, выконваючым абавязкі міністра замежных спраў Кнолем і дырэктарам усходняга дэпартаменту міністэрства замежных спраў Галуўнам.

Адначасна заўтра ў Вільню прыяжджае польскі пасланьнік у Рызе Лукасэвіч. Міністр унутраных спраў Сладкоўскі ўжо знаходзіцца ў Вільні.

### Асаблівая гарбатка.

Гэтымі днямі, як паведамляе «Газ. Варш. Поранна» ў прыватным памяшканьні віцэпрэм'ера Бартэля адбылася палітычная гарбатка. На ёй былі ўсе міністры і запрошаныя грамадзкія дзеячы. Быў на ёй і маршал Пілсудзкі. Гарбатка была зроблена «дзеля ўшанаваньня А. Марачэўскага», якога пэпэсы гэтымі днямі выкінулі з партыі.

Запрошаны былі і віднейшыя пэпэсы, але яны на гарбатку не зьявіліся. Між іншым быў запрошан і стары пэпэсэс пасол Дашынскі, былы прыхільнік Пілсудзкага, але і ён ухіліўся ад удзелу ў вечарыне. «Істотнай тэндэнцыяй гэтай гарбаткі было жаданьне выклікаць у ППС раскол»,—піша «Газ. Варш. Пор.».

### Ангельская газэта аб літоўска-польскіх адносінах.

Газэта «Таймс» паведамляе, што ў ангельскіх дыпляматычных колах занепакоены палітычным палажэньнем у балтыцкіх краёх.

„Таймс" сьцьвярджае, што надзеі, якія мела італьяанская дыпляматыя падчас візыту Вальдэмараса ў Рыме ў кірунку ўрэгуляваньня стасункай Літвы і Польшчы, ня спраўдзіліся; газэта пры гэтым успамінае аб меўнымся быццам намеры надзяліць Віленшчыну з аддачай Вільні Літве.

### Разгон пасольскага мітынгу.

6 верасьня ў Тарнове, Кракаўскага ваяводзтва, быў склікан паслямі сойму Вітасам і Дубелем і сэнатарам Сыцібэрам мітынг. Пасьля рэфэрату Вітаса, калі павінен быў прамаўляць Дубель, у залю ўвайшла паліцыя з карабінамі і, не зважаючы на пратэсты, разагнала мітынг, перапісаўшы ўсіх прысутных.

Мітынг быў дазволен мясцовай уладай, а разагнаны ваяводзкай.

### Канфіскацыі.

За надрукаваньне вестак аб тым, што перагаворы польскага ўраду з прадстаўнікамі амэрыканскага капіталу сарваны, шмат польскіх газэт сканфіскаваны, у тым ліку віленскі чорнасоценны «Дзеньнік Віленскі».

### Расколы ў левых польскіх партыях.

«Уплыў» сучаснага ўраду на раскол ды развал польскіх работніцкіх і сялянскіх партый ня спыняецца.

Толькі што надрукавана ў газэтах заява аднаго з правінцыяльных аддзелаў ППС, якая пратэстуе проці апазіцыйнага становішча партыі, а перад усім—соймавага клюбу пэпэсаў, адносна да ўраду Пілсудзкага. Ясна, што гэты пратэст пагражае пакуль што не расколам, а адколам ад партыі.

Пачаўся цэпер «ісход» пілсудчыкаў і з «Вызваленьня», якое пад націскам на мясцох—таксама займае апазіцыйнае становішча ў адносінах да ўраду.

## ЛІТВА Ў ЖАЛОБЕ ПА ВІЛЬНІ.

КОЎНЯ, 8-Х. Узьвязк у з угодкамі захопу Вільні, 9-га кастрычніка па ўсёй Літве абвешчана нацыянальная жалоба. Газэты выйшлі з жалобнымі рамкамі, з артыкуламі і лёзунгамі, прысьвечанымі захопу. Усе відовішчы і забавы адменены.

У грамадзкіх і ўрадавых памяшканьнях адбудуцца лекцыі і даклады, прысьвечаныя захопу Вільні.

### Напад шаўлісаў.

У райёне Рыкаў па літоўскім пагранічча зьявілася некалькі дзесяткаў літоўскіх шаўлісаў і пачалі рубаць лес, які знаходзіўся на польскім баку. Пасьля спатычкі з польскім патрулём, шаўлісы ўцяклі.

### Тэрор.

Урад Вальдэмарса ў далейшым застасоўвае тэрор у адносінах да сапраўдэмакратаў. У Шаўлях арыштаваны паслы сойму—сацыял-дэмакраты Янушкіс і Маркіліс. Абодвы яны будуць адкавацъ перад палявым судом і прыгэтым ім пагражае кара сьмерцю.

Адначасова ў Панявежы арыштован пасол с.-д. Жукоўскі, а ў Коўні паслы Саналоўскі і Якубоўскі.

## КАСТРЫЧНІКАВАЯ ПЕРАКЛІЧКА.

МЭКСІКА, 8-Х. Рабочыя нафтавых промыслаў у Танпіко дэлегуюць у СССР свайго прадстаўніка для ўдзелу ў Кастрычнікавых урачыстасьцях.

### Дэлегацыя рабочых Мэксікі.

МЭКСІКА, 5-Х. Генэральны сэкратар мэксіканскага прафэсыянальнага саюзу чыгуначнікаў і транспартнікаў Барыёс выяжджае ў СССР для ўдзелу ва ўрачыстасьцях, прысьвечаных 10-ым угодкам Кастрычнікавае рэвалюцыі.

Рабочыя нафтавых промыслаў у Томпіко пасылаюць для ўдзелу ва ўрачыстасьцях двох прадстаўнікоў.

## ПРЫДУШЭНЬНЕ РЭАКЦЫЙНАГА МЕЦЯЖУ Ў МЭКСІЦЫ.

МЭКСІКА, 9-Х. Урадавае войска ня спыняе наступаць на войска Гомэса. У тыле Гомэса арганізуюцца ўзброеныя сялянскія атрады, каб адрэзаць яму адступленьне. Упяршыню пасьля 3 кастрычніка ў Веракруц накіраваўся пасажырскі поезд, што тлумачыцца, як адзнака перакананасьці ўраду ў сваіх сілах.

### Рабочыя падтрымліваюць Кайеса.

НЬЮ-ЁРК, 8-Х. «Уоркерс Парты» агаласіла тэлеграму, атрыманую ад мэксіканскае кампартыі.

«Ракцыя—гаворыцца ў тэлеграме—распачала наўстаньне. Мы заклікаем вас да абароны інтарэсаў мэксіканскага пралетарыяту, які разам з урадам змагаецца проці контр-рэвалюцыі».

## ЛІКВІДАЦЫЯ БЕЛАГВАРДЗЕЙСКАЕ АРГАНІЗАЦЫІ Ў РЫЗЕ.

РЫГА, 8-Х. Загадам латвійскага ўраду зачынен манархічны саюз расейскае белагвардзейскае моладзі ў Латвіі, да якога належаў удзельнік ленінградзкага працэсу Самойлаў.

Устаноўлена, што саюз займаўся манархічнай агітацыяй і тэрарыстычнай дзейнасьцю. Адзін з кіраўнікоў саюзу Майдановіч высылаецца з Латвіі.

## ПАД СЬЦЯГАМ ВЫКРЫВАНЬНЯ РЭФАРМІСЦКАГА ПРАДАЖНІЦТВА.

### Зьезд ангельскае кампартыі.

МАНЧЭСТЭР, 8-Х. Сёньня раніцою ў Сальфордзе (у ваколіцы Манчэстэру) адчыніўся 9-ты зьезд камуністычнае партыі Вялікабрытаніі.

Ад імя ЦК сказаў прывітаньне зьезду Хорнэр. Заявіўшы, што кампартыя не дазволіць запужваць сябе правакацыйнымі прамовамі Джойнсона Хікса, Хорнэр падкрэсьліў, што неблысьнека вайны ў выніку разрыву Англіі з СССР павялічылася і зазначыў на здрадніцкую ролю рэфармістаў, якія імкнуцца зруйнаваць салідарнасьць рабочых Англіі і СССР. «Партыя,—сказаў Хорнэр,—павінна зрабіць усё магчымае, каб перасьцерагчы рабочую клясу ад небясьпек, якімі гэта пагражае».

Спыніўшыся на выніках зьезду рабочае партыі, Хорнэр заявіў: «Гэты зьезд цалкам пацьвердзіў абвінавачаньні, якія ўскладаюцца камуністамі на лідэраў рабочае партыі». У канцы прамовы Хорнэр зазначыў: «Наша партыя—адзін з атрадаў самага вялікага і адзінага руху на чале з Камуністычным Інтэрнацыяналам. І маніць тыя, хто завярае, што Камінтэрн—бляшэцкая арганізацыя і не спадзяецца заваяваць сымпатыі большасьці рабочых.

**Правільны марксыцкі аналіз і бязупынная праца—вось што нам патрэбна, каб заслужыць кіраўніцтва масамі, адхіліўшы ад яго рэфармістаў».**

**З палітычным дакладам ЦК выступіў Ротштэйн.** Зазначыўшы, што капіталістычны наступ можа быць адбіты толькі адзіным фронтам працоўных, Ротштэйн заявіў, што ажыцьцяўляць адзіны фронт, гэта ня значыць спагадаць злачынствам рэфармізму, прыкладам чаго можа служыць зусім правільная тактыка УЦСПС у дачы пеньні англа-расейскага камітэту.

Даклад быў ухвален зьездам аднагодна.

### ПРЫВІТАНЬНЕ УСЕКП(б) АД ЗЬЕЗДУ.

МАНЧЭСТЭР, 9-Х. Зьезд ухваліў рэзалюцыю прывітаньня УсеКП(б) з прычыны 10-ае гадавіны Кастрычніка, у якой гаворыцца: Кампартыя Англіі зробіць усё магчымае, каб замацаваць саюз пралетарыяту Англіі і СССР. Гэта будзе з нашага боку найлепшым укладам ў сьвяткаваньне Кыстрычнікавае рэвалюцыі».

Потым на трыбуне зьяўляецца Ганінгтон і прапануе наступную дэкларацыю: «Мы клянёмся бараніць першую рабочую рэспубліку, не шкадуючы свайго жыцьця».

Зьезд наладжвае Ганінгтону авацыю. Дэлегаты ўсталюць і пяюць «Інтэрнацыянал».

## За дзень.

### Па ўказцы Чэмбэрлена.

У Парыж прыехаў Дэтэрдынг, за ім Чэмбэрлен, а за ім Чэрчыль. Хутка ў Парыжы апынецца ўвесь габінэт міністраў Англіі. Прыезд кіраўнікоў кансэрватыўнага ўраду ў Парыж носіць дэманстрацыйны характар і, зразумела, набывае поўнае палітычнае значэньне.

Кожны разумее, што ў Парыжы будзе ствараца адзіны супроцьсавецкі блёк. За чый конт? Хто будзе аплачваць пляны цьвёрдалобых?—Гэта мае другараднае значэньне. Сярод эўрапейскіх дзяржаў ёсьць шмат супярэчнасьцяў. На сьвеце існуюць спрэчныя зоны, як, напрыклад, Танжэр, за які ідзе барацьба паміж Францыяй, Англіяй і Гішпаніяй. Жыва яшчэ Нямеччына,—за яе сьпіной пасьля кожнай сэсіі Лігі Нацый таксама можна ствараць розныя дагаворы. Урэшце можна таксама напомніць Пуанкарэ, што Францыя вінна Англіі і Амэрыцы 1.436.065.000 фунт. стэрлінгаў. А гэта значыць, што Чэмбэрлен мае шмат сродкаў узьдзейнічаньня на французкую палітыку. У крайнім выпадку, Чэмбэрлен зможа найсьці па некаторыя другарадныя ўступкі для таго, каб паскорыць франка-савецкі разрыў.

«Бюлетэнь Котыд'еп»—орган буйнейшага аб'яднаньня французкай цяжкай індустрыі, лічыць, што пытаньне аб франка-савецкім разрыве ўжо вырашана. «Калі сапраўды разрыў яшчэ не ажыцьцёўлен і калі французкі пасланьнік у Маскве яшчэ знаходзіцца, дык усё-ж адразу пасьля адъезду Ракоўскага з Парыжу будуць спынены распачатыя перагаворы».

Французкі ўрад, выказаўшыся за адкліканьне Ракоўскага, гэтым самым паставіў пад удар усе франка-савецкія адносіны. Відома, што ўрад Пуанкарэ некалькі тыдняў таму ўхваліў пастанову, у якой ён даручыў свайму міністру замежных спраў весьці ў далейшым перагаворы аб заключэньні з намі гарантыйнага дагавору аб ненападзе. Пасьля месячнай лютай атакі правага друку, Пуанкарэ, быццам пад націскам грамадзкай думкі, паставіў зноў пытаньне аб водкліку т. Ракоўскага.

Ці ня значыць гэта, што французкі ўрад гэтым пагражае Англіі, што яна можа найсьці на ўтварэньне франка-савецкага ўгавору аб ненападзе ў выпадку калі Англія ёй за гэта добра не заплоціць? Для заспакаеньня дробных трымацеляў царскіх грашовых папераў Пуанкарэ гаворыць:—я супроць разрыву, але «грамадзкая думка» гэтага патрабуе. А для замежнай палітыкі Пуанкарэ гаворыць:—як Англія ня патрэбуе даўгі, як Англія ня спыніць свае супроцьфранцускія выступленьні па пытаньню аб Танжэры, я магу найсьці на дагавор з СССР. Бліжэйшая будучыня выкрые ўсе гэтыя пляны Пуанкарэ.

Пытаньне аб водкліку т. Ракоўскага рашчапіла грамадзкую думку Францыі. Паша паведамленьне аб даўгох стварыла яшчэ большыя перашкоды для тых, якія дамагаюцца разрыву з СССР. Цяжка казаць, ці з посьпехам закончыцца падарожжа ангельскіх міністраў у Парыж. Мы ведаем, што англа-французкія супярэчнасьці вельмі вялікія, але не на адну хвіліну не забываем, што ў барацьбе супроць СССР Англія і Францыя могуць знайсьці агульны язык. Таму больш пільна будзем сачыць за англа-французкімі перагаворамі.

### Філёзофія Гомперса.

Аб зьезьдзе амэрыканскай фэдэрацыі працы мы пакуль што ведаем мала, але і тое, што нам паведамляюць тэлеграмы ТААС'а, мы можам скласьці сабе ўражань не аб гэтых «днёх адпачынку» амэрыканскіх прафсаюзных бюракратаў. Мы гаворым аб «днёх адпачынку», бо хто ня ведае, што для гэтых джэнтльмэнаў двохтыднёвае жыцьцё на курорце, дзе адбываецца насяджэньне зьезду вызначае сабой іх адносіны да яго.

Вострых палітычных пытаньняў там не разглядаюць, альбо вырашаюць іх на вызначанаму трафарэту. На кожнага дэлегата, які патрабуе адмовіцца ад гэтага трафарэту, глядзяць, як на нейкага бузацёра, які недалікатна атручвае дні адпачынку няпрыемнымі пытаньнямі.

Лаянкі супроць камуністаў і СССР складаюць асноўную частку цэрэманіялу вызначанаму на кангрэсе і на гэтым кангрэсе гэты ганаровы абавязак узяў на сябе старшыня фэдэрацыі Грын. Сваю лаянку ён закончыў гэткай глыбокадумнай формулай: «Мы вэрым у філёзофію Гомперса і ня верым у філёзофію Леніна, Сталіна, Томскага і Лазоўскага.

Гэтая філёзофія ня вельміскладаная. Вось яе асновы: Амэрыка—лепшая краіна ўсьвеце і амэрыканская канстытуцыя—вышэйшае дасягненьне дэмакратыі. Адносіны Злучаных Штатаў Паўночнай Амэрыкі да іншых краін вызначаюць і адносіны Амэрыканскай фэдэрацыі працы да Амстэрдамскага Інтэрнацыяналу. Злучаныя Штаты не ўваходзяць у Лігу Нацый, а гэта значыць, што АФП не павінен уваходзіць у Амстэрдамскі Інтэрнацыянал. Калі Злучаныя Штаты прэтэндуюць на панаваньне ў Цэнтральнай і Паўночнай Амэрыцы, дык АФП павінен падначаліць сабе рабочы рух гэтых краін враз так званую Панамэрыканскую фэдэрацыю працы. Белая раса вышэй за жоўтую і чорную амэрыканцы вышэй эўрапейцаў. Таму АФП за забарону імміграцыі рабочых з іншых краін, тым больш з краін жоўтай расы. Нэгру ня можна дапушчаць у адны саюзы з белымі. Гэту пастанову яшчэ раз пацьвердзіў кангрэс АФП, які зараз адбываецца.

Патрыятызм—вышэйшая дабрачынасьць. Таму АФП супрацоўнічае з фашысцкім амэрыканкім легіёнам, які ўзяў сабе маналію на патрыятызм. Таму АФП у дзень юбілею амэрыканскага легіёну—19 верасьня паслаў ім прывітальную тэлеграму ў Парыж.

Але досыць аб гэтым. Філёзофія Гомперса досыць ясна. Але яна ўжо не панае над рабочым рухам Амэрыкі. Факт прыезду да нас амэрыканскай рабочай дэлегацыі сьведчыць аб тым, што філёзофія Гомперса ўжо дае трэшчыны ў рабочым руху і што ў хуткім часе «філёзофія Гомперса» застанецца панаваць толькі над вумом Грына і да яго падобных.

### Польска-літоўскі канфлікт.

Літоўска-польскі канфлікт патроху набірае ўсё больш сур'ёзнасьці. На разгул літоўскага фашызму, скіраванага ня толькі проці палякаў і польскіх школ у Літве, а і проці літоўскіх-жа апазіцыйных элемэнтаў і проці немцаў і, відаць, і беларусаў, і расейцаў, і яўрэяў і іншых,—Польшча, г. ё. польскае грамадзянства і польскі ўрад у нязвычайна рэзкі спосаб востра заарэгавалі, пагражаючы распраўцца з Літвою чуць не аружнаю сілаю. Пакуль што Польшча абмежавалася рэпрэсіямі проці сваіх-жа польскіх грамадзян літоўскай нацыянальнасьці і проці літоўскіх школ. У паветры «паўночна-усходніх крэсаў» Польшчы ізноў моцна запахла кулачнаю расправаю, астрогам, паліцэйскім засьценкам—гэтымі аблюбаванымі ў Польшчы спосабамі ўрэгуляваньня нацыянальна-палітычных спраў польскіх нацменшасьцяў. Ці вінаваты ліцьвіны, якія маюць няшчасьце пражываць у межах сучаснай Польшчы, што фашыстаўскі ўрад Вальдэмараса праводзіць у Ковенскай Літве палітыку рэпрэсій да ўсіх неспачуваючых фашызму, у тым ліку і да палякаў. Калі рэпрэсіі ў адносінах да літоўскіх палякаў і прымяняліся ўрадам Вальдэмараса больш інтэнсыўна, чым да іншых літоўскіх нацменшасьцяў, дык і тады ня трэба гэтаму дзівіцца, бо справы Літвы з Польшчай да апошняй пары яшчэ не ўрэгуляваны, і літоўскі фашызм, апіраючыся на ўзбуджаны нацыяналізм і шавінізм народных мас, выяўляе сваю дзікую волю ў рэпрэсіях. Гэта папершае. Падругое, літоўскія работніцка-сялянскія масы, як і беларускія і украінскія, прызвычаіліся з даўных часоў відзець у Польшчы і польскіх панох свайго прыгнятацеля, свайго найгоршага ворага, які яго зьняволіў і цэпер няволіць.

Пражываючыя ў Польшчы ліцьвіны, беларусы і украінцы, за рэдкім выключэньнем, вельмі адмоўна глядзяць на палітыку сучаснай Польшчы ў адносінах да гэтых нацыянальнасьцяў і пры гэтым лічаць, што тэрыторыі гэтых нацыянальнасьцяў адабраны ад іх сілаю польскага аружжа. Польшча аб гэтым усім таксама добра ведае, але ў той самы час нічога ня робіць такога, каб залагодзіць нездаволеньне сваіх нацменшасьцяў. Наадварот, апошнімі сваімі рэпрэсіямі проці «сваіх» ліцьвіноў, як ранейшымі рэпрэсіямі проці беларусаў з «Грамады», яна толькі ўзмацняе антыпольскі настрой у самой Польшчы і па-за яе межамі.

Замест рэпрэсій Польшча мела поўную магчымасьць залагодзіць канфлікт зваротам хоць бы ў Лігу Нацый, да якой і Польшча і Літва належаць, або зваротам да сваёй саюзьніцы Францыі і сваёй апякуншы Англіі,—адным словам спрабаваць больш праўныя спосабы і больш культурныя. А то выпла проста дзіка: за рэпрэсіі літоўскага ўраду, застасаваныя проці палякаў Ковенскай Літвы, нясуць адказнасьць ліцьвіны, пражываючыя ў Польшчы. Дзе тут лёгіка?

## АРМІЯ ХО-ЛЮНА РАСПЫЛЕНА ГУАНДУНЬЦАМІ.

### Хо-Люн цяжка паранен.

ШАНХАЙ, 8-

# У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

## ПОСЬПЕХ ПАЗЫКІ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

**НІЖНІ НОЎГАРАД.** Падпіска на пазыку індустрыялізацыі дасягае па заводах 30-ці тысяч рублёў штодзённа. Агульная сума падпіскі перавышае 300 тысяч рублёў.

**САРАТАЎ.** Па першых падлінах падпіска ў калектывах Саратава дасягнула 80-ці тысяч рублёў. На шмат якіх прадпрыёмствах і ўстановах падпіска на пазыку прайшла пагалоўна.

**ІЖАЎСК.** На 6-га кастрычніка па Іжаўску падпіска на пазыку індустрыялізацыі дала 102 тысячы рублёў.

## Тыраж 2-е сялянскае пазыкі.

### Буйныя выйгрышы.

МАСКВА, 7-10. 7 кастрычніка скончыўся тыраж другое дзяржаўнае сялянскае выйгрышнае пазыкі 1925 г. Выйгрышы **па адной тысячы руб.** прыпалі на наступныя нумары аблігацый ва ўсіх 10-ці сэрыях пазыкі: №№ 0.041.958, 0.077.935, 0.864.357, 1.119.828 і 1.929.870. Выйгрыш **у 5 тысяч руб.** ва ўсіх 10 сэрыях пазыкі прыпаў на аблігацыю № 1.844.083.

## Падзяка ўдзельнікам адэскіх манэўраў.

У загадзе Рэвалюцыйнага Вайсковага Савету СССР наконт адэскіх манэўраў гаворыцца, што манэўры паказалі бязмоўныя дасягненьні ў галіне ўзаемадзейнічаньня і баявое падрыхтоўкі сухаземных, марскіх і паветраных сіл.

Падсумоўваючы працу паветраных сіл, загад адзначае, што адэскія манэўры далі новы доказ усебаковага росту чырвоных паветраных сіл. У поўнай перакананасьці, што іх вопыт будзе дакладна вывучан і паслужыць у далейшым умацаванню нашае магутнасьці, Рэвалюцыйны Вайсковы Савет абвяшчае падзяку ўсяму асабоваму складу вайскова-паветраных сіл, браўшаму ўдзел у манэўрах.

## Ангельскія каапэратары на Паўночным Каўказе.

РАСТОЎ-ДОН. Вярнулася з падарожжа ў Наварасейск ангельская каапэрацыйная дэлегацыя. Ангельскія каапэратары аглядалі порт і склады Экспортхлеба, між іншым, склады, дзе ляжыць макуха, закупленая ангельскімі каапэратарамі. Дэлегацыя адзначыла дасканалае абсталяваньне порту і цалкам здавальняючы спосаб сховані грузаў.

З Растову дэлегацыя выехала ў Бярдзянск.

### Проці фракцыянэраў.

КЗЫЛ-АРДА. Актыў партыйнае арганізацыі Кзыл-Арды аднагодна ўхваліў рэзалюцыю, якая патрабуе ўжыць самыя рашучыя меры проці раскольніцкае дзейнасьці апазіцыі.

Актыў заклікае казакстанскую арганізацыю да асаблівае пільнасьці, каб напярэдзіць магчымыя вылазкі апазіцыі ў нацыянальным пытаньні.

### Сэсія ўсеукраінскага ЦВК.

ХАРКАЎ, 8-Х. Сёньня раніцою ў тэатры імя Шэўчэнка адчынілася другая сэсія Ўсеукраінскага Цэнтральнага Выкапаўчага Камітэту. На сэсію прыбыло 340 членаў УЦВК. Пасьля агалашэньня і ўхвалы павесткі сэсіі з прывітальнаю прамоваю выступіў старшыня УЦВК Пятроўскі.

# Літоўскі ўнівэрсытэт.

Перад вайною 1914—1920 г. на ўсёй валікім абшары Літвы і Беларусі ня было ні воднаго асяродка вышэйшае навукі, Тыя, што залажылася ў Вільні (унівэрсытэт) і ў Горках (сельска-гаспадарчы інстытут) былі пазачынены царскім урадам па палітычных прычынах пасьля няпоўных трох дзесяткаў гадоў існаваньня. Больш, як паўвеку Літва і Беларусь ня мелі на сваіх абшарах ні аднае вышэйшае школы. За гэты час тэмп жыцьця рабіўся ўсё хутчэйшым. Іншыя райёны імпэрыі рясьлі шпаркім тэмпам і эканамічна, і культурна, і толькі Літва і Беларусь заставаліся ў занепадзе.

Сярод краёвае інтэлігэнцыі было зразуменьне патрабы вышэйшае школы, і ня раз узнімалася хадайніцтва перад уралам аб адчыненьні ўнівэрсытэту. Але ні Вільня, ні Менск, ні нават Віцебск і Магілеў не прызнаваліся царскім урадам за падходныя сядзібы дзеля ўнівэрсытэту. Вільня, як найвялікшае места і асяродак краю і як колішні ўнівэрсытэцкі цэнтр мела найбольш правоў на адчыненьне ўнівэрсытэту. Але яе-та царскі ўрад і найбольш баяўся. У Вільні жылі яшчэ рэшткі традыцыяў ад існаваўшага ў ёй польскага ўнівэрсытэту, хаця бы і даўно зачыненага, у Вільні польскі элемэнт быў мацнейшы, чым у кожным іншым месьце Літвы і Беларусі. Апрача таго, Вільня вяўлялася культурным асяродкам дзеля літоўскага культурна-нацыянальнага руху, і ў Вільні-жа пачынаў крэпнуць беларускі культурна-нацыянальны рух. Пры такіх абставінах царскаму ўраду было ясна, што адчыненьне ўнівэрсытэту ў Вільні толькі прыспорыла бы яму палітычных клопатаў і абвастрыла-бы мясцовыя нацыяналізмы. Адчыніць унівэрсытэт у якім небудзь іншым беларускім месьце—значыла-бы згадзіцца на ўтварэньне з яго пасьля пэўнага працягу часу вогнішча беларускае культуры і абніжарацьня гэтым русіфікацыйных задачаў ураду. Так працягнулася справа да пачатку вялікае вайны.

Вайна нямецка-расейская, а потым польска-савецкая ўнесьлі вялікія зьмены ў жыцьцё краю. Папершае, край аказаўся падзеленым на тры часткі, і падругое, значна на зьнішчаным. У трох частках краю запанавалі розныя гаспадары: ва Ўсходняй часьці Беларусі з Менскам замацавалася ўлада рабочых і сялян, у Заходняй Беларусі з Вільняю загаспадарылі польскія паны, а ў Літве з Коўнаю—спачатку нацыяналістычныя ксяндзы, а потым зьявіліся і дамарослыя фашысты.

Падзел краю ўнёс у свой чарод вялікія зьмены ў эканамічнае і культурнае яго жыцьцё, якое ў трох частках пайшло на розную. Калі перад вайною на абшарах краю ня было ні аднаго ўнівэрсытэту дык цяпер зьявілася аж тры—на адную ў кожнай частцы. Гэтыя ўнівэрсытэты ў трох розных частках краю створаны трыма рознымі гаспадарамі і служаць трём розным мэтам. Унівэрсытэт у Менску створаны перамогшымі рабочымі і сялянамі і мае сваім назначэньнем даваць рабоча-сялянскай моладзі веды, якія дамагалі бы ёй у далейшай працы па будаўніцтву камунізму, унівэрсытэт у Вільні створаны вяўнічым польскім нацыяналізмам і служыць выключна інтарэсам палёнізацыі. Унівэрсытэт у Коўні створаны младым літоўскім нацыяналізмам і павінен выхоўваць у адпаведным духу літоўскую моладзь.

Літоўскі ўнівэрсытэт у Коўні створаны нашлей, чым Віленскі і Менскі, і наскольки можна судзіць па тых адрывачных вестках аб яго працы, што даходзяць сюды,—ідзе горш за іх. Афіцыяльнае адчыненьне Літоўскага ўнівэрсытэту адбылося 16-га лютага 1922 г. Да таго часу ў Коўні існавалі Вышэйшыя Навуковыя курсы, заложаныя ў 1920 годзе і меўшыя к моманту адчыненьня ўнівэрсытэту 481 студэнтаў і вольных слухачоў.

Першыя некалькі гадоў унівэрсытэт меў вельмі слабую матар'яльную базу і змагаўся з вялізнымі цяжкасьцямі, якія проста пагражалі яго існаваньню. Адсутнасьць наміцканьняў і навуковага абсталяваньня, адсутнасьць кваліфікаваных пэдагагічных сілаў не давалі магчымасьці разьвярнуць працу нармальнага ўнівэрсытэцкага маштабу. На меры таго, як гэтыя цяжкасьці перамагаліся, расла і лічба студэнтаў. Угосень 1922 г. было 1168 студэнтаў, у 1923 г.—1380, у 1924 г.—1795, у 1925 г.—2368 і ў 1926 г.—3066. Толькі ад 1924-25 акадэмічнага году Літоўскі ўнівэрсытэт больш-менш стаў на цьвёрдым грунце: узмацніўся ўнівэрсытэцкі бюджэт, былі запрошаны новыя кваліфікаваныя выкладчыкі немцы і расейцы, а ў сувязі з узмацненьнем унівэрсытэту навялічыўся і наплыў моладзі. Зьявіліся нават студэнты—грамадзяне іншых дзяржаў: у 1926-27 г. 53 чалавекі (1,7 проц. агульнае лічбы студэнтаў).

Па факультэтах студэнты дзеляцца так: тэолёгічна-філёзофскі факультэт мае 294 студэнты, тэолёгічна-эвангэлішкі—10, гуманістычны—534, юрыдычны—948, матэматычна-прыродазнаўчы—362, мэдычны—562 і тэхнічны—354. Дзьве рысы зьвяртаюць тут на сябе ўвагу: падершае, налічваець аж двох тэолёгічных факультэтаў і падругое, надмерная дзеля дзяржавы з двума мільёнамі насельнасьці лічба студэнтаў на іншых факультэтах, якім проста дзявацца няма куды пасьля выпуску.

Крызіс надмернага вырабу інтэлігэнтаў нізкае якасьці, які ведаюць унівэрсытэты ў Вільні, у Менску і іншых местах, асабліва востра ўстае перад Ковенскім унівэрсытэтам дзеля надта малое ёмкасьці Ковенскае дзяржавы. Менскі ўнівэрсытэт існуе ў рэспубліцы з 5 млн. насельнасьці.

Апрача таго, зьлішак яго прадукцыі можа збывацца ў іншыя савецкія рэспублікі, асабліва-ж у сумежныя беларускія райёны РСФСР. Віленскі ўнівэрсытэт мае перад сабою вялізныя абшары „Усходніх Крэсаў" з 5 млн. насельнасьці, а Ковенскі—толькі двохміліённую Літву. Дзеля гэтага ўтрымаць яго на належнай вышыні цяжка, а прадукцыю збываць няма дзе.

Па нацыянальнасьці студэнты Літоўскага ўнівэрсытэту дзеляцца так: літоўцаў—68,5 проц., яўрэяў—27,1 проц., палякаў—2,1 проц., расейцаў—1 проц. і іншых—1,3 проц.

Агульна-студэнцкіх арганізацыяў няма. Існуе 41 студэнцкае таварыства, большасьць з іх толькі на паперы. 14 арганізацый ёсьць палітычных, 2—эканамічныя, 4—нацыянальныя, 7—навуковых, 3 спартыўныя, 8—спэцыяльных, 3—тэрытарыяльныя. Большая частка арганізацый—літоўскія з шавіністычным духам, 7 ёсьць арганізацый чыста-яўрэйскіх, адна польская і адна расейская.

Варункі існаваньня студэнтаў такія, што моцна абмяжоўваюць доступ да вышэйшае навукі бяднейшым сялянам і рабочым. Плата за навучаньне выносіць 100 літаў за паўгода (каля 20 р.). Апрача таго, ёсьць спэцыяльныя даплаты за карыстаньне лябараторыямі, так што агульная плата даходзіць да 60-70 р. у год. Пры хранічным гаспадарчым крызісе і застоі—гэта наважная сума. Дзеля беднасьці ўрадавых асыгнаваньняў ад платы звальняюцца ня многія. Стыпэндыі на 3066 студэнтаў атрымліваюць толькі 135 чалавек, усяго 4 процанты!

Наогул, Літоўскі ўнівэрсытэт у Коўні знаходзіцца ў няспрыяючых абставінах.

**М. С.**

# Весткі адусюль.

### Рэпрэсіі за сувязь з Мопр'ам.

РЫМ, 7-Х. Учора ў надзвычайным трыбунале скончыўся працэс 4-х асоб, якія абвінавачваліся ў атрыманьні грашовае дапамогі ад Мопр'у з Парыжу і Ніцы для перадачы сваяком, зьняволеным па палітычных справах.

Усе абвінавачаныя засуджаны да зьняволеньня на тэрмін ад аднаго з паловаю да 3-х год і да спэцыяльнага паліцэйскага нагляду ў працягу 3-х год пасьля адсідкі.

### Рэкорд вышыні на авіэтцы.

ЛЁНДАН, 8-Х. Жанчына-лётнік ангельчанка Эліёт Лінь узьнялася на авіэтцы на вышыню ў 19 тысяч футаў—рэкордную для самалётаў гэтага тыпу.

### Вялікі пажар у Пэшвэры.

ЛЁНДАН, 8-Х. Агенцтва Рэйтэр паведамляе: «Пажарам, які распачаўся ад выпадковае прычыны ўчора раніцою ў найбольш густа заселеным квартале Пэшвэр (Індыя, недалёка ад афганскае граніцы), зьнішчана звыш тысячы дамоў».

### Скліч франка-расейскага парляманцкага к-ту.

**ПАРЫЖ, 8-Х. Сацыялістычны дэпутат Шасьсі зьвярнуўся з лістом да старшыні франка-расейскае парляманцкае групы Філіпота, у якім прапануе тэрмінова склікаць нараду франка-расейскае групы, каб ухваліць пастанову наконт кампаніі правае прэсы проці Ракоўскага, багатае сур'ёзнымі вынікамі для франка-савецкіх адносін.**

### Зьезд мангольскае нар.-рэв. партыі.

УЛАН БАТОР, 6-10. 6-ты зьезд мангольскае народна-рэвалюцыйнае партыі скончыўся. Зьезд пацьвердзіў у рэзалюцыі правільнасьць узятага партыяй курсу на зьбліжэньне з СССР і сусьветным рэвалюцыйным рухам. Зьезд абраў новы ЦК з 45 чалавек.

Пасьля зьезду адбыўся пленум ЦК, які абраў кіраўнікоў цэнтральных установаў. Старшынёю ЦК пераабраны Дамба-Дорджы, старшынёю ЦКК абраны Бассола.

### Прыём у пэрсідзкім пасольстве СССР.

КАБУЛ, 5-10. 4-га кастрычніка, у зьвязку з падпісаньнем савецка-пэрсідзкае згоды, у паўнамоцным прадстаўніцтве СССР у Кабуле (Аўганістан) адбыўся прыём, на якім прысутнічалі пэрсідзкі, турецкі, нямецкі і італьянскі пасланьнікі, а таксама прадстаўнікі дыпляматычных місій.

# На Беларускай ССР.

## (Ад нашых карэспандэнтаў).

### На акруговых зьездах работніц і сялянак.

ГОМЕЛЬ, 9-Х. Раніцою 8 кастрычніка адбіліся спрэчкі па дакладу аб народнай асьвеце. Зьезд зазначыў на неабходнасьць далейшага пашырэньня сеткі культурна-асьветных установаў, між іншым, вячэрніх сялянскіх школ, запранаваў РВК'ам пакланаціцца аб дастаўцы школам апалу, ухваліў навучаньне дзяцей на роднай для іх беларускай мове і г. д. Інспэктура аховы здароўя запранавана павялічыць кадр дактароў у райёнах, прывесьці ў парадак студні, павялічыць колькасьць ложкаў у больніцах і г. д.

Зьезд зьвярнуўся да ўсіх работніц і сялянак з заклікам добра падрыхтавацца і добра адсьвяткаваць дзень угодак Кастрычнікавае рэвалюцыі.

На ўсесаюзны зьезд жанчын-членаў саветаў абрана 5 дэлегатак з правам рашаючага голасу і 1—з правам дарадчага.

Зьезд скончыў сваю працу ў 4 гадзіны 8 кастрычніка.

Дэлегаткі зьезду ўдзельнічалі ў вынярэдніцтве па стральбе. Дэлегатка Кавалёва выбіла 19 ачкоў, а Багамолава, 51 год, ніколі ня трымаўшая ў руках вінтоўкі—5 ачкоў.

МАГІЛЕЎ, 10-Х. 8-га кастрычніка скончыўся акруговы зьезд грамадзкіх працаўніц. Урачыстае адчыненьне адбылося 6-га. Зьезд адчыніў старшыня выканкому Дзякаў. Віталі зьезд прадстаўнікі ўсіх арганізацыяў. Ад акруговага камітэту партыі выступіў Грысевіч, ад ЦВК і ЦК партыі Нарком Працы Бэнэ. Зьездам заслуханы чатыры даклады. Выяўлена нячуваная актыўнасьць. Выказалася 110 таварышоў з 150 дэлегатак, выступалі на перабой. Праца зьезду выключна прадукцыйная, зьезд выявіў значныя дасягненьні ў працы па ўцягваньні ў савецкае будаўніцтва. На ўсесаюзны зьезд абрана 5 дэлегатак.

### КАРТА ПІСЬМЕННАСЬЦІ ГРАМАДЗЯНСТВА.

**Віцебск, 10-10.** Акруговы савет Т-ва «П. Н.» выпускае спэцыяльную карту, характарызуючую становішча пісьменнасьці дарослага жыхарства акругі. Да сьвята Кастрычніка карта будзе разаслана па райёнах.

### ПАБУДОВА НОВАГА ВАДАПРАВОДУ.

**Магілеў, 10-10.** Гарсавет пастанавіў пабудаваць новы вадаправод, у мэтах лепшага абслугоўваньня насельніцтва вадой. Зараз відзецца падрыхтоўчая праца. Пабудова вадаправоду будзе каштаваць каля 30.000 руб. Ужо заключана ўмова з Маскоўскім Арматрэстам.

### ЛЕС СЯЛЯНСТВУ.

**Магілеў, 9-10.** Сёлета насельніцтву акругі адпушчана з лясоў дзяржаўнага значэньня 89 тысяч куб. мэтраў драўніны і 194 тыс. куб. мэтраў на апал.

Лес ужо разьмяркован па райёнах.

На дарэмны і льготны (ад 10 да 75 проц. скідкі) водпуск лесу вызначана на акругу 40 тысяч рублёў. І па крэдытаваньне лесам — 125 тысяч руб. Гэтыя грошы разьмяркованы па сельсаветах і разьмяркоўцца паміж дварамі ў сельсавецкай камісіі.

### ШТО ДАЛА КАМПАНІЯ ЗА АШЧАДНАСЬЦЬ.

**Бабруйск, 10-10.** Усяго па акрузе ўцягнута ў касы ашчаднасьці 1686 новых укладчыкаў з сумай укладаў на 35.676 руб. Па г. Бабруйску ўступіла ў касы 368 укладчыкаў па 7.280 руб. укладаў.

### ЗАГАТОЎКІ СЫРЦУ.

**МАГІЛЕЎ, 9-Х.** Пленум акруговага выканкому зацьвердзіў сёлетнія загатоўкі дзяржаўных і каапэрацыйных органаў у такіх прыблізна лічбах: ільняного валакна—87 тысяч пудоў, ільняного семя—140 тысяч пудоў, пянькі—45 тысяч пудоў.

Скураной сыравіны—31 тысяча пудоў—буйнае і 146 тысяч—дробнае жывёлы (у мінулым годзе плян на скуры быў выпаўнен з перавышэньнем на 50 проц., дзеля чаго сёлета вызначан падвышаны плян).

Шчаціны—3400 пудоў і воласу—9 тысяч пудоў.

### ПАДПІСВАЮЦЦА НА ПАЗЫКУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

**Гомель, 8-10.** Кампанія па рэалізацыі пазыкі індустрыялізацыі разгортваецца. Дзяржбанкам рэалізавана на 6000 р., т-вам узаемнага крэдыту—на 5000 р., акрфінадзелам—на 3000 рублёў, раббанкам—да 12000 р. Акруговая камісія дапамогі рэалізацыі пазыкі індустрыялізацыі прыцягвае ў якасьці контрагента кустпрамсаюз і пазыка-ашчаднае т-ва. Саматужныя арцелі прадпіяўляюць попыт на аблігацыі гэтай пазыкі.

### АКРУГОВЫЯ КАНФЭРЭНЦЫІ ПРАФСАЮЗАЎ.

**Гомель, 8-10.** Скончаны канфэрэнцыі саюзаў: мэталістаў, дрэваапрацоўнікаў, гарбароў, працаўнікоў зямлі і лесу, народнага харчаваньня, камунальнікаў, савгандпслужачых. У бліжэйшыя дні адбудуцца канфэрэнцыі рэшты прафсаюзаў. Па ўсіх канфэрэнцыях былі абраны дэлегаты на ўсебеларускі зьезд прафсаюзаў.

### ДЗЬВЕ БЯДЫ.

Адна была бяда, калі насупулася навальніца з громам, пяруном, градам.. Наварочала будынкі, пазмывала збожжа. У дадатак, макрата праз усё лета, - на пізніх павымакалі аўсы, бульба. Гэта адна была бяда Варанковічу з Бахараўкі, калі ў яго прапала некалькі дзесяцін збожжа...

Другая, горшая бяда стала, калі ён захацеў дабіцца законнай скідкі па сельгаснадарчаму падатку за вымачку.

Схадзіў некалькі разоў у Лагойск, пакуль дабіўся, каб прыехала камісія агледзіць.

Камісія прыехала дось аўтарытэтная; нават з страх. агэнтам і агрономам. Агледзіла. Склала акт аб вымачцы і паехала. Праз месяца паўтара—нашоў Варанковіч у Лагойскую фінчасьць пытаць, дзе акты.

Там пашукалі, пашукалі і кажуць:

— Магчыма, калі ёсьць, дык у загадчыка, з ён у водпуску, прыдзе праз нядзельку 2—15 верасьня.

Прышоў да загадчыка. Шукаў, шукаў, не знайшоў.

— У нас, кажа, вашага акту ня было.

Варанковіч да страхагэнта.

— Дзе акт,—пытае.

— На што табе?

— Трэба падатак зьняць.

— Зьнімуць без цябе.

— Як без мяне зьнімуць?

— Ды так, што зьнімуць: я даўно акт накіраваў у фінчасьць.

— Ды я некалькі разоў быў там і не знайшлі.

— Ня добра, знадь, шукалі акт там.

Пайшоў Варанковіч зноў у фінчасьць. Сказьніўся. Пайшоў у другую нядзелю.

— Няма ў нас акту,—катэгарычна заявілі ў фінчасьці,—схадзі прынясі № акту і калі ён да нас адасланы.

Зноў пайшоў. Узяў № 22.

Зноў прышоў у фінчасьць. Зноў шукалі, не знайшлі.

Прышоў у наступную нядзелю. Зноў шукалі.

— Няхай агэнт дасьць расьніску, хто ўзяў гэты акт.

Зноў пайшоў хадзіць Варанковіч з фінчасьці да страхагэнта (дарога больш вярсты), ад страхагэнта да фінчасьці, з Лагойску дамой, з дому ў Лагойск. І да сёньня не даведаўся: пасьлаў страхагэнт акт у фінчасьць, ці не.

Сёньня яму ў страхагэнта сказалі: пашлём копію акта ў другі раз. Невядома, як будзе.

Ня ведае (згубіў лік) Варанковіч, колькі разоў ён схадзіў у Лагойск, а там у фінчасьць і да страхагэнта.

— Горшая, кажа, бяда дабіцца скідкі, чым тая навальніца, бо часу ўжо прайшло каля 3-х месяцаў, а канца ня відаць.

**М. Лагойск, Меншчына.**

**Калючы.**

### ДЗЯРЖАЎНАЕ СТРАХАВАНЬНЕ Ў 1927-28 ГОДЗЕ.

**Гомель, 10-Х.** На пляну акстраха ў бягучым апэрацыйным годзе па акрузе будзе сабрана 520 тыс. руб. па ўсіх відах страхаваньня. На кожны сялянскі двор страхавых плацяжоў у сярэднім прыпадае 5 р. 20 к.

### КААПЭРАВАНЬНЕ ПЧАЛЯРОЎ.

**Гомель, 10-Х.** У сучасны момант у акрузе 530 каапэраваных пчаляроў. Усяго пчаляроў у акрузе налічваецца 1762 чал.

### ПАДРЫХТОЎКА ДА ПАБУДОВЫ МАСТА КАЛЯ ВЁСКІ ХАЛЬЧ.

**Гомель, 10-Х.** Акрвыканком адпусьціў 10 тыс. руб. на падрыхтоўчую працу па пабудове каля вёскі Хальч маста. Ужо будуюцца кузьня і склады для матар'ялаў, да месца пабудовы звозяцца бакі і ў бліжэйшы час пачынаецца пабудова капроў (прылада для забіўкі свай).

На працу першае чаргі патрэбна 200 тыс. руб., якіх чакаюць у хуткім часе.

Мост каля вёскі Хальч мае вялікае значэньне для акругі, бо гэты мост палегчыць рух праз Хальч і Ветку на Гомель.

### ПРАКЛАДКА ШАШЫ МІЖ ГОМЕЛЕМ І ВЕТКАЙ.

**Гомель, 10-Х.** Акруговы камунальны аддзел у сучасны момант заканчвае працу па забрукаваньню вучастку Гомель—Прудок, агульным працягам у 1600 мэтраў. У будучым годзе акруговы аддзел камунальнае гаспадаркі прадугледжвае распачаць забрукаваньне вёскі Прудок з тым, каб да 1931 году пралажыць шашу да Веткі, агульным працягам у 20 кілёмэтраў.

### ПАБУДОВА МАСЛАБОЙНЫХ ЗАВОДАЎ.

**Гомель, 10-Х.** Палессельсаюз намеціў пабудаваць у працягу надыходзячае зімы 7 новых маслабойных заводаў у акрузе. Будзе таксама пабудавана 11 будынкаў для хаваньня масла і 4 для хаваньня малака.

Лік малочных арцеляў у акрузе павялічваецца ў гэтым годзе на 15 адзінак.

### МЭХАНІЗАЦЫЯ ЦАГЕЛЬНЫХ ЗАВОДАЎ.

**Бабруйск, 10-10.** На цагельных заводах акругі зроблена частковая мэханізацыя. У гэтым годзе намечана канчаткова мэханізаваць усе цагельныя заводы.

# Кастрычнікавая рэвалюцыя абудзіла і работніц капіталістычных краін.

Вялікая Кастрычнікавая Рэвалюцыя была для работніц капіталістычных краін, як і для ўсяго пралетарыяту, магутным рычагом, які піхнуў іх на шлях актыўнай барацьбы з капіталізмам.

Ня гледзячы на мора маны і паклёпаў, якія распаўсюджваюцца прадажным буржуазным друкам, краіна Саветаў у працягу дзесяці гадоў была абкружана спачуваньнем пралетарыяў і пралетарак капіталістычных краін.

Так, у 1918 годзе, калі нямецкі імпэрыялізм імкнуўся задушыць маладую Савецкую рэспубліку, аўстрыйскія работніцы абмундыравальных заводаў арганізавалі забастоўку пратэсту.

У 1920 годзе, калі Польшча пачала вайну з Савецкай Расеяй і калі Антанта спрабавала перавозіць праз Аўстрыю ўзброеньне і амуніцыю, рабочыя і работніцы паўсталі супроць гэтай спробы і перашкодзілі ажыцьцяўленьню яе.

У часе ультыматуму Керзана ангельскі ўрад, напалоханы рашучасьцю, з якой рабочыя і работніцы Англіі выступілі на абарону Савецкага Саюзу, адмовіўся ад сваіх злачынных плянаў.

У сучасны момант, калі ўвесь буржуазны сьвет, напалоханы шпаркім ростам сацыялістычнай гаспадаркі Савецкай краіны, пасьпешна рыхтуецца да вайны з СССР, работніцы Англіі, Нямеччыны, Францыі на шматлікіх дэманстрацыях, мітынгах, сходах гучна заяўляюць свайму ўраду: «Рукі прэч ад Савецкай краіны».

Нямецкія камуністкі на сваёй апошняй парадзе заяўляюць, што сумесна з Англіяй уздымаецца капіталістычная кляса ўсяго сьвету супроць Савецкага Саюзу, а разам з тым і супроць усёй рабочай клясы. Лёс расейскіх рабочых—гэта наш лёс.

Заваёва расейскім пралетарыятам улады ў Кастрычніку, актыўны ўдзел работніц і сялянак у гэтай барацьбе, эканамічнае і прававое вызваленьне працоўных жанчын у Савецкіх рэспубліках пры ўладзе пралетарыяту, улілі ў сэрца работніц усяго сьвету бадзёрасьць, рашучасьць і веру ў пасьпешны канец барацьбы.

Зацікаўленасьць і цяга рабочых і работніц да СССР асабліва ўзмацніліся ў апошні час у зьвязку з пагоршаньнем становішча рабочай клясы на Захадзе і ў зьвязку са шпаркім і магутным ростам сацыялістычнай гаспадаркі ў Савецкім Саюзе.

Цэлы шэраг дэлегацый, якія прыяжджалі ў СССР, мелі магчымасьць блізка прыглядзецца да таго, як працоўныя Савецкага Саюзу з жалезнай упартасьцю і настойлівасьцю, з моцнай верай ў свае ўласныя сілы, з непарушнай цьвёрдасьцю і стойкасьцю, перамагаючы вялікія труднасьці, будуюць сваю сацыялістычную гаспадарку і прымаюць такім чынам удзел у падрыхтоўцы сусьветнай рэвалюцыі.

У гэтых дэлегацыях прымалі ўдзел таксама і работніцы. Увосень мінулага году СССР наведала дэлегацыя нямецкіх работніц. Нават сацыял-дэмакратыі і частка бесспартыйных работніц, спачатку недаверліва і варожа настроеных да СССР, пры блізкім знаёмстве з посьпехамі і дасягненьнямі народнай гаспадаркі, з матар'яльным палепшаньнем становішча рабочай клясы, з поўным вызваленьнем працоўных жанчын у СССР,—зрабіліся вернымі прыяцелямі пралетарскай дзяржавы.

На сотнях сходаў, мітынгаў, дэманстрацый у сябе дома моцна прагучэў заклік удзельніц шматлікіх рабочых дэлегацый у СССР—заклік да абароны першай у сьвеце пралетарскай дзяржавы—крэпасьці сусьветнай рэвалюцыі—ад усіх выпадаў і ваенных змоў сусьветных імпэрыялістаў.

Гэрачная барацьба рабочай клясы СССР зьяўляецца натхніцелем і работніц капіталістычных краін да рашучай барацьбы з эксплёатацыяй і ўціскам.

Пашыраецца і расьце іх удзел у рэвалюцыйнай барацьбе сусьветнага пралетарыяту.

За апошні год мы часта бачым працоўных жанчын у перадавых калёнах паўстаўшага пралетарыяту: так было ў часе забастоўкі ангельскіх гарнякоў, у часе забастоўкі тэкстыльніц у Пасаіцы (Зл. Штаты), у шматлікіх забастоўках, якія хваляй разьліліся па Італіі, ня гледзячы на лютае праследаваньне з боку фашысцкага ўраду.

І па Ўсходзе ўчарашнія невольніцы ўздымаюць сьцяг паўстаньня на фабрыках, палёх, капальнях, патрабуючы прызнаньня за сабою чалавечых правоў.

Багаты творчы вопыт УсеКП(б) у галіне працы сярод працоўных жанчын ня толькі ўважліва вывучаецца нашымі братэрскімі кампартыямі, але ўжо з посьпехам ужываецца імі для арганізацыі працоўных жанчын у сваіх краінах. Так, у Нямеччыне ў сучасны момант працуе 30 дэлегацкіх сходаў, у якія ўваходзіць 335 дэлегатак. Дэлегацкія сходы таксама арганізаваны ў цэлым шэрагу іншых краін.

За апошнія гады і ў капіталістычных краінах паладжан жаночы друк, які не зьяўляецца толькі друкам для работніц, але часопісам саміх работніц, на старонках якога яны шырока асьвятляюць усе свае патрэбы.

У справе вызваленьня шырокіх працоўных жаночых масаў ад уплыву фальшывай буржуазнай прэсы, у справе палітычнай мабілізацыі працоўных жанчын пад чырвоным баявым сьцягам Камуністычнага Інтэрнацыяналу важную ролю грае таксама перапіска, міжнародная сувязь між работніцамі СССР і працоўнымі жанчынамі капіталістычных краін.

З вялікай зацікаўленасьцю сачаць работніцы СССР за ўсімі нарыядамі надзвычайна цяжкай барацьбы сусьветнага пралетарыяту. У сваіх лістох апісваюць яны ня толькі свае дасягненьні, але і тыя вялікія труднасьці, якія ім прыходзіцца перамагаць на сваім шляху, каб сваім прыкладам, вялікай верай запаліць сэрца сваіх сёстраў на працы, веру ў свае сілы і працаваць змагацца за камунізм, ня спыняючыся ні перад якімі axвярамі.

Гэта міжнародная сувязь дапамагае ўтварэньню адзінага фронту ўсіх працоўных, выхаваньню работніц у духу рэвалюцыйнага інтэрнацыяналізму, узмацненьню братэрскай міжнароднай салідарнасьці і ператварае шырокія масы жанчын з тормазу рэвалюцыі, як гэта дзе-нідзе яшчэ наглядаецца,—у рычаг рэвалюцыі.

**З. Б.**

# Праезд праз Менск дэлегацыі нямецкіх жанчын.

## Спатканьне дэлегацыі ў Негарэлым.

*(Ад спэцыяльнага карэспандэнта).*

Для спатканьня дэлегацыі нямецкіх жанчын-дэлегатак на ўсесаюзны зьезд жанчын-членаў саветаў з Менску ў Негарэлае прыбыла дэлегацыя ў ліку 20 чалавек.

У 10 гадзін вечара 9-га кастрычніка польскі цягнік падыйшоў да станцыі Негарэлае. З цягніка вышлі 6 нямецкіх дэлегатак. Усе накіраваліся ў новы будынак станцыі. За таварыскай вячэрай да дэлегацыі з прывітаньнем зьвярнулася тав. Танаеўцава, якая ў кароткай прамове абмалявала становішча і ўдзел жанчын СССР у дзяржаўным будаўніцтве.

### МЫ РАЗСКАЖАМ АБ ДАСЯГНЕНЬНЯХ ЗА 10 ГАДОЎ.

У адказ на прывітаньне тав. Танаеўцавай сказала кароткую прамову Маргарыта Ганэ—старшыня нямецкай дэлегацыі.

— Мы едзем у Маскву на 2-гі зьезд работніц і сялянак—членаў саветаў,—кажа т. Ганэ,—і гэта нас асабліва цешыць, бо ў нас у Нямеччыне жанчына ня мае права ўдзельнічаць у парляманце. Жанчыны СССР нас апераздзілі.

На зьезьдзе будуць падагулены вынікі за 10 гадоў сацыялістычнага будаўніцтва—аб гэтых выніках мы раскажам жанчыне Нямеччыны.

Азнаёміўшыся з тым, што даў Вялікая Кастрычнік для работніц і рабочых СССР, мы разаб'ём брудныя плёткі буржуазных газэт Нямеччыны.

Пасьля прамовы тав. Ганэ, нямецкая дэлегацыя разам з сустракаўшымі іх, па нямецкай і расейскай мове прасьпявалі «Інтэрнацыянал».

Дэлегацыя адъехала ў Менск і далей у Маскву.

### СКЛАД НЯМЕЦКАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ.

У склад дэлегацыі ўваходзяць работніцы: Маргарыта Ганэ (старшыня дэлегацыі) з Брэслаўля, Гэрміна, Баас, з Бэрліну, Фрыда Крумрэйль з Дрэздэну, Ганна Грос з Бэрліну, Марта Кнап і Люба Краўзэ з Бэрліну.

Сярод дэлегатак—дзьве камуністкі: адна з 1919, другая з 1923 году.

**Дэлегацыя нямецкіх жанчын.**

(Трэцяя справа—Маргарыта Ганэ)

# ЗЬЕЗД РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК МЕНШЧЫНЫ.

## Выхаваем здаровых дзяцей. Дамо добрую зьмену. Пабудуем новае жыцьцё. Узмацнім грамадзянскую мэдыцыну.

*(З дакладу аб ахове здароўя ў акрузе).*

### ШТО ПАВІННА ЦІКАВІЦЬ ЖАНЧЫНУ.

Ёсьць шмат пытаньняў, якія асабліва цікавяць і хвалюць нашых жанчын. Гэта пытаньні быту—як пабудаваць новае жыцьцё, як выхаваць моцнае здаровае пакаленьне і г. д. На гэтыя пытаньні павінна даць адказ савецкая мэдыцына.

Ахова здароўя ёсьць частка нашага быту і частка савецкага будаўніцтва. Галоўнай задачай савецкае мэдыцыны ёсьць стварэньне такіх умоў, пры якіх можна было-б не лячыць хваробу, а асьцерагаць ад яе чалавека. Дабрабыт, гігіена, хаты, лазьня, чыстата—складаюць частку грамадзянскай мэдыцыны.

### АХОВА ЗДАРОЎЯ РАНЕЙ І ЦЯПЕР.

У дарэвалюцыйны час Беларусь была асабліва адсталай і гэта вельмі адбівалася на становішчы здароўя насельніцтва. Мэдыцыны тады амаль зусім ня было, калі ня лічыць адной яўрэйскай больніцы ў Менску і адной земскай больніцы, якая абслугоўвала насельніцтва ўсяе губэрні.

### ЧАГО МЫ ДАСЯГНУЛІ.

Нашы дасягненьні ў галіне аховы здароўя характарызуюцца наступнымі лічбамі: у 1926-27 г. на гэту справу расходавана 2.916.818 р., што складае 3 р. 34 к. на аднаго чалавека, у той час,

# Юбілей 4-га Чырвонаштандарнага палка.

## Савецкая Беларусь шчыра вітае байцоў 4-га палка з сьвяткаваньнем 9 гадавіны.

## Гэраічныя перамогі 4-га палка над ворагамі, яго баявыя традыцыі--будзе памятаць краіна Саветаў.

## 9-я ГАДАВІНА.

Сьвяткуючы 9-ю гадавіну нашага Чырвонаштандарнага палка, мы таксама сьвяткуем і дзень перамогі палка 2 кастрычніка 1920 г.

Гэты гістарычны дзень быў радасным для ўсіх байцоў палка тым, што гады, як ніколі, выявілася моц часьцей, узаемная выручка, адвага і адно жаданьне—ня даць у зьнявагу Чырвоную армію, паказаць, як трэба змагацца за інтарэсы і заваёвы працоўных.

Памятны гэты дзень і ўспамінаючы б нашых славутых гэроях, якія былі ахвярамі прарыву кальца палякаў, што адрэзала нас ад СССР. Толькі зжкуючы рэвалюцыйнаму ўздыму, гульняму жаданьню адстаяць сталіцу Беларусі ад пянавіснага пана, дало магчымасць дабіцца тых вынікаў, якія еў полк у дзень бою пад Радашковічамі. Выйсьці з абкружаньня, разьбіць мацнейшага на сіле ворага, захаваць трафэі—задача ня лёгкая, але на была выканана.

Вынік бою, у адзнаку якога мы станавілі палкавое сьвята, заслугоўвае ўвагі ня толькі трафэямі, якія былі ўзяты палком, ня толькі тым, што байцы лішні раз упэўніліся ў сваёй сіле, але і тым, што гэты бой паказаў польскаму пану, наколькі дорагі заваёвы працоўных, як Чырвоная армія іх абараняе.

4 гады мірнага будаўніцтва, праводзячы мірную вучобу, полк не забывае сваіх старых баявых традыцыяў. На сваёй гісторыі, на яскравых прыкладах мінулага ён выхоўвае абаронцаў пралетарыяту. За гэтыя гады ён падрыхтаваў вялікія рэзэрвы, гатовыя па першаму заклiку стаць пад баявыя штандары.

Пераступаючы на 10 гадавіну існаваньня палка, ушануем памяць забітых гэрояў.

Дэмабілізаваным старым ветэранам шлём гарачае прывітаньне.

Моладзі і ўдзельнікам баявога жыцьця палка пажадаем посьпеху ў баявой падрыхтоўцы, захаваньню баявых традыцыяў, падтрыманьні баявога духу, з якім калісь ішлі да перамог.

**Больш упэўненасьці ў свае сілы, цясьней сувязь з працоўнымі, кадру з пераменным складам—гэта наша бліжэйшая задача.**

К-р палка **Скугараў.**

## Ад камандваньня 2 Беларускай стралковай дызізіі 4 ЧЫРВОНАШТАНДАРНАМУ ПАЛКУ.

Камандваньне 2 Беларускай, імя тав. Фрунзэ, дывізіі, адзначаючы вялікія заслугі 4 Чырвонаштандарнага палка перад рабочымі і сялянамі савецкай краіны, у прыватнасьці Савецкай Беларусі, вітае камандзіраў, палітніраўнікоў і чырвонаармейцаў з гадавінаю палка і з тэй заслужанай славай, якую мае полк.

Камандваньне дывізіі ўвэўнена, што пры сучасных міжнародных абставінах, калі небясьпека вайны супроць Савецкага Саюзу расьце—начальніцкі склад палка і ўсе чырвонаармейцы прыложаць максымум энэргіі для таго, каб быць у поўнай баявой гатоўнасьці. Камандваньне дывізіі ўпэўнена, што калі Чырвонай армії зноў прыдзецца ўступіць у бойну з ворагамі савецкіх рэспублік—4 Чырвонаштандарны полк пойдзе па шляху сваіх слаўных баявых традыцыяў і побач з іншымі часьцямі Чырвонай армії пад ідэйным кіраўніцтвам камуністычнай партыі будзе гэройскі абараняць СССР.

Камандзір і ваенком дывізіі **ЛАКЦІЁНАЎ.**

Начальнік Штабу **СЬМІРНОЎ.**

## Слаўнаму 4 палку.

Палітычны аддзел і камандаваньне 33 Самарскай стр. дывізіі ў дзевятую гадавіну 4 палка 2 Беларускай дывізіі шлюць шчырае прывітаньне чырвонаармейцамі начальніцкаму складу, упэўненыя ў тым, што баявыя традыцыі палка, яго слаўнае мінулае яшчэ больш узмоцніць сталёвыя шэрагі байцоў, каб у гадзіну, калі пакліча камуністычная партыя і савецкая ўлада выступіць на абарону Савецкага Саюзу і скрышыць галовы капіталістым, якія падрыхтоўваюць вайну супроць рабочае дзяржавы.

Няхай жыве камуністычная партыя, правадыр і арганізатар пабед Чырвонае армії!

Няхай жыве моцны на страх ворагам слаўны Чырвонаштандарны 4 полк.

Вайсковы камісар і начальнік палітычнага аддзелу 33 дывізіі **МІН. АРАБЕЙ.**

## Наш юбілей.

Гэй, Беларусы! Ці панаваньне ўланаў польскіх ты помніш?

Рэкі крыві, стогны працоўных, языкі агністыя, што хаткі нашы лізалі і ўшчэнт зьнішчалі, хіба хто забудзе калі?

Ой, не! Гэта ў памяці кожнага яшчэ доўга жыць будзе.

Ад старога да малога, з вуснаў у вусны, з кніжкі ў кніжку—вечна жыць будзе ў памяці час разгулу палякага.

Дрыжэла паветра ад гарматнага грукату, стагнала зямелька сьлязьмі—крывёю залітая, царпеў беларус у зьнявазе і бядноце.

* * *

Восень 1920 году.

Ноч на 12 кастрычніка.

Вільгасьцю паветра напоўнена, вецер сьцюдзёны твар мокры шчыпле. Надворʼе нібы радуецца нашай няўдачы.

Напура, утомленна, але пянавісьці клясавай поўная, цягнецца цёмна-шэрая маса.

Стала калюмна. Усё замёрла. Дожджык васеньні сьвішча на твару ваякі. Але што дожджык! Кулі сьвісталі і то хоць-бы хны!

Стала калюмна.

Сьпіць, маʼбыць, вораг.

Камандзіры палкоў на нарадзе.

* * *

Моўчкі рушыць брыгада. Блізкім боем запахла. Стрэльба напагатове.

Перад носам Радашковічы. Там спакойна адпачываюць «славутыя ваякі»—уланы. Пагараваліся, небаракі, добро людзкае рабуючы!

Зусім блізка стрэл.

Наткнулися на варту.

Пачалося.

Ажыла маўклівая маса. Агнём перамогі заблішчэлі вочы. Баявое натхненьне з пачалавечаю сілаю накіравала спадзейную руку пралетарскага ваякі на панскі карак.

— Ура-а-а!—перамяшалася са стрэламі і закружыла ў паветры.

— Радашковічы павінны быць нашы!—нарашыла нарада камандзіраў палкоў.

Дружны націск—і уланы наўцекі, пакідаючы ахвяры на вуліцы.

Ура-а-а! Радашковічы нашы! Толькі-б пасьпець падабраць трафэі, а шмат іх было. Да паўсотні забітых і 20 параненых палякаў кінута на вуліцы. Абоз, кулямёты.

Наша страта—паранена два стралкі. Гэта не хвастаўство, а гістарычная даведка. Бо куля варожая не спраўлялася лавіць адданых чырвоных ваяк.

Так было. Такая гісторыя вядомага Радашковіцкага прарыву.

Посьпех брыгады (цяпер 4 палка) прымусіў адыйсьці палякаў ад Менску, каб пакрыць прарыў. Гэтым фронт польскі пад Менскам паслабеў.

Гэтае паслабленьне скарысталі чырвоныя часьці, самі ўзмацніліся, ворага затрымалі і—больш паляк у Менску ня быў.

* * *

Так заявалі байцы 6-й брыгады, з якой утварыўся наш 4 Чырвонаштандарны полк.

Наша сьвята—сьвята перамогі баявых заслуг палка.

Іх ня можа забыць сучасны вайсковец палка, іх ведаць і помніць павінен селянін і рабочы Беларусі.

**Міх. Калента.**

## Чырвоныя штандары-баявыя традыцыі

Ззаду 9 гадоў, шмат перамог вялікіх і цяжкіх. Цяпер чырвоныя штандары—баявыя традыцыі і ўпартая вучоба для будучай барацьбы за ўладу Саветаў. Што ні вёска на Барысаўшчыне то адзін—другі дзесятак ужо новых загартаваных байцоў. Што ні хата-чытальня—вайсковы куток, гурток вайсковых ведаў. Больш тысячы сяброў ТДА-Авіяхіму і што ні хата перамеснік—паша вайсковая газэта «На Страже». Моцная партыйная арганізацыя, больш соценны камсамол, загартаваны сьвядомы камскład, моцная дысцыпліна, добрыя посьпехі ў вучобе—вось наш сёньняшні дзень.

У наступным задача:

яшчэ большае павялічэньне баяздольнасьці, сталая падрыхтоўка дзеля сустрэчы ворагаў, якія жадаюць напасьці на нас. Без адной думкі сумненьня рыхтуецца кожны баец 4 палка да будучых баёў. Апошнім укладам у нашу баяздольнасьць зьяўляецца чарговы выпуск малодшага камскладу, які адбудзецца к 9-й гадавіне. К гэтаму дню полк атрымаў і новы сярэдні камскład. Сёньня адзінай цеснай сямʼёй зробім сьмелы крок на 10-ы год. У моцнай сувязі частак 2-й Беларускай, імя правадыра М. В. Фрунзэ, дывізіі Чырвонаштарны полк пойдзе к перамогам.

Няхай жыве юбіляр—Чырвонаштандарац!

**П. Ч.**

## Бой за форт „Бэрг (Графскі)".

(Успаміны удзельніка).

Сонца яшчэ нявысока, а ўжо паліць сваімі прамеснымі твары байцоў. То сям, то там раздаюцца рэдкія стрэлы, якія ня трывожаць, аднак, стралкоў 6 роты 16 палка, якія разьмясьціліся каля невялічкіх кустоў. Лежачы ў акопах, стралкі ўспамінаюць аб былым учора баі за захват форта Казловічы. Наводчык «максіма» любоўна агляднае сваю машыну, якая ніколі не зьмяняла яму ў баёх. Сувязісты ўстанавілі тэлефонную лінію і правяраюць яе. Заціша для байцоў, ужо ведаўшых сваю баявую задачу, зьяўлялася толькі падрыхтоўкай да новага бою за Бярэсьце (Брэст-Літоўск). Адзін, другі, трэці, дзесяткі стрэлаў гарматаў даюць сыгнал для агульнага наступу. З крыкам «ура» уздымаюцца шэрыя масы, кідаюцца на форт. А форт умацован, нават артылерыя не змагла разьбіць шматлікавых радоў калючага дроту. З вялікім энтузіязмам, з вераю ў сваю перамогу, хоць і без нажоў для рэзкі дроту, байцы разрываюць яго рукамі і ўрываюцца ў замацаваны форт. Нашы страты ў гэтым баю невялікія, а посьпех—захоп форта Бэрг, які даў нашым часьцям магчымасьць захапіць горад Бярэсьце (Брэст-Літоўск). 6 брыгада—цяпер 4 полк—з гонарам выканала баявую задачу па захопу Брэст-Літоўска, за што і атрымала чырвоны штандар, пад якім 4 Чырвонаштандарны полк будзе бараніць заваёвы Кастрычніка ў будучых бойках.

**Удзельнік бою Бялоў.**

## БАЯВЫ ШЛЯХ ПАЛКА.

### Першае фармаваньне.

Маладая рэспубліка толькі пачала аладжваць сваё жыцьцё як на яе са сіх бакоў пачалі налятаць «белыя ры». Заклявацъ ім хацелася ўладу рацоўных. У гэты час, у чэрвені меяцы 1918 г., з трох дабрахвотных азлоўскага, Тамбоўскага і Маршанскага палкоў у г. Тамбове арганізавалася 3-я брыгада—цяпер 4-ты полк—з першых дзён павяла барацьбу супроць контр-рэвалюцыі ў Тамбоўскай бэрні.

### Усходні фронт.

Адмірал Калчак, якога падтрымліваі капіталісты ўсіх краін, дайшоў да амары і зьбіраўся спраўляць перамоў у Маскве. Папоўненая, абучаная -я брыгада другой дывізіі ў сакавіку 919 г. кідаецца насустрач ворагу мачным націскам у напрамку па Бугуслан, Бугульму, Белебей, адгаяе онтр-рэвалюцыю да Белай.

### Петраградзкі фронт.

У небясьпечны час для першай стацы працоўных, першага бунтара—Леінграда, у чэрвені месяцы 1919 г. -я брыгада пераводзіцца на Петраградзкі фронт, дзе да кастрычніка меяца вядзе барацьбу з бандамі генэрала Юдзеніча і з баямі падыходзіць да кі Лугі. У кастрычніку месяцы 1919 г. онтрнаступам генэрала Юдзеніча брыда адкідваецца зноў да Ленінграда і рафармоўваецца ў 10 полк 6-й брыды імя т. Каліса, у склад якой уваодзяць і іншыя баявыя палкі Паўочнага фронту.

### Пулкаўская апэрацыя.

6-я брыгада сфармаваная з часьцей -й брыгады, 22 кастрычніка зноў пеходзіць у наступ уздоўж Балтыцкай ягунгі, Гатчынскай шашы і 23 кастрычніка захапляе ст. Аляксандраўская—Мыза Таліцы. Юдзеніч назаўсёды згубіў надзею на Ленінград.

### Галейшая барацьба на Петраградзкім фронце.

З 30 кастрычніка 1919 г. па 1-е удзеня 1920 г. 6-я брыгада абараняе Ленінград. З вялікімі посьпехамі праходзіць баявыя апэрацыі пад Гатчынай, Ямбургам, Аляксандраўскай Горкай, Нарвай і разам з усімі часьцямі -й арміі дабіла генэрала Юдзеніча. 1 удзеня на фронце брыгады зроблена рамірʼе з Эстоніяй.

### Латвійскі фронт.

З 5 красавіка па 24 чэрвеня брыда ў вельмі цяжкіх умовах вядзе барацьбу з Латвійскай арміяй, бо праўнік быў куды мацнейшы. Адбіваючы лёты ворага, брыгада і сама робіць кія-ж налёты. З гэтых налётаў асліва выдасьцца паскок 16 палка на ску Нячавы.

### Польскі фронт.

Чэрвень—кастрычнік 20 г.

Разьбіт Калчак, Юдзеніч, Дзенікін, а мест іх перад рэспублікай зазіхацела абля польскага пана. Дабіць і гэтага рага—было адзіным жаданьнем праўных. 6 брыгада 5 чэрвеня 1920 г. ракідаецца на захад. Пачаўшы наступ 9 ліпеня, брыгада пераходзіць ра Бярэзіну і з лёзунгам «даёш Варшаву» захапляе ст. Асіповічы, горад цак, м-ка Рамапаў і к 29-му ліпеня падыходзіць да Бярэсьця (Брэст-Літоўск). Самым гэраічным посьпехам брыгады на польскім фронце было захоп Бярэсьця (Брэст-Літоўска), дзе брыгада ў працягу з 10 гадзін 31 ліпеня па 3 жніўня захапіла форт Казловічы, форт Бэрг (Графскі), прарвала моцныя пазіцыі ворага, перайшла раку Буг і 4 жніўня пайшла далей і захапляе форт Тэраспаль, ст. Лобічава. 11 жніўня брыгада забірае г. Седлец, 12-га—Станіславоў і 14 жніўня ст. Валошын, недалёка ад Варшавы.

### Адыход ад Варшавы.

Гэраічны быў і адыход брыгады ад Варшавы, які пачаўся ў той час, калі вораг быў далёка ў тыле. Ня губляючы свайго баявога парадку брыгада з баямі адыходзіць.

21 жніўня, абкружаная ў вёсцы Вялікая Туросьня, каля Беластоку, брыгада магутным ударам сваіх палкоў разрывае кальцо і далей выпаўняе баявую задачу. Другі, яшчэ больш слаўны прарыў быў зроблен брыгадай пад мястэчкам Радашковічы 12 кастрычніка, у знак чаго 4 полк, намесьнік быўшай 6-й брыгады і сьвяткуе сёньня свае палкавое сьвята. Апошнім прарывам брыгада затрымоўвае наступ палякаў на Менск, які імі ў другі раз так і ня быў узяты.

Мір з Польшчай 6-ю брыгаду захапляе ў м. Радашковічах. Ведаюць 6-ю брыгаду і бандыты, якія пускаліся ў Беларусь панамі і з якімі брыгада вяла барацьбу ў Менскім раёне ў 1921 г.

### У Калузе

У верасьні 1921 г. брыгада згрупоўваецца ў Калускай губэрні, дзе далей узмацняе свае сілы. За гэты час 14 лістапада пераймяноўваецца ў 4 брыгаду 2-й дывізіі ў складзе палкоў 10, 11 і 12-га. У 1922 г. з брыгады арганізуецца адзін 4 полк, прыняўшы ўсе баявыя традыцыі 3, 4 і 6 брыгады 2-й дывізіі.

### Зноў на Беларусі.

У сакавіку 23 году 4 полк зноў пераводзіцца ў Беларусь у складзе ўсёй 2-й дывізіі пераходзіць на тэрсыстэму. Працуючы разам з рабочымі і сялянамі Барысаўшчыны, полк ня мала паклаў працы па ўзмацненьне тэрытарыяльнай сыстэмы рабоча-сялянскай Чырвонай арміі.

### Баявыя ўзнагароды палка.

За свае гэраічныя дзеяньні на шматлікіх франтох 4 Чырвонаштандарны полк мае шмат баявых заслуг, якія даюць яму правы займаць пачэснае месца ў шэрагах Чырвонай арміі. Так, за ўзяцьце Бярэсьця (Брэст-Літоўска) і бой пад Радашковічамі полк атрымаў пачэсны рэвалюцыйны чырвоны штандар ад Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту РСФСР. За баі на Паўночным фронце полк атрымаў ад рабочых Ленінграду пачэсны рэвалюцыйны штандар ад савету прафсаюзаў. Асобныя вайскова-служачыя палка за час грамадзянскай вайны атрымалі 71 ордэн Чырвонага Штандару і іншых узнагарод 458.

За ўсе баявыя посьпехі полк атрымаў вышэйшую ўзнагароду — назву **Чырвонаштандарны.**

На мірным фронце полк з такімі-ж посьпехамі ўзмацняе свае сілы, што надае байцам упэўненасьць у будучых перамогах.

**П. Ч.**

## Старэйшы кампалітсклад палка.



Сядзяць: адказны сэкр. партюяро **КАЛЕНТА**, кампалка **СКУГАРАЎ**, ваенком **КОЎЗУН**, начштаба **ГАЎРЫЛАЎ**.
Стаяць: камбат 1 **АБЕЛЬЧУК**, памкампалка **МАЙСЕЕЎ**, ст. доктар **КУЛЬЦЕПІН**, камбат 2 **НАУМАЎ**.

## Загад

**4-МУ ЧЫРВОНАШТАНДАРНАМУ ПАЛКУ 2-Й БЕЛ. СТР. ІМЯ М.В ФРУНЗЭ, ДЫВІЗІІ.**

Гор. Нова-Барысаў. № 319. 12 кастрычніка 1927 г.

Сёньня наш Чырвонаштандарны полк святкуе сваё палкавое сьвята і сваю 9-ю гадавіну.

Сфармаваны ў найцяжэйшую гадзіну для робчых і сялян, у 1918 г., ён на працягу ей грамадзянскай вайны стойка бараніў заёвы Кастрычнікавай рэвалюцыі. Жыцьцём лепшых сыноў пралетарыяту плаціў ён, як і ўся Чырвоная армія, на працягу ух гадоў за лепшае будучае працоўных. І іх магілах, цяпер на адной шостай стцы ўсяго сьвету ўзрос ачаг сусьветнай рэвалюцыі СССР—сацыялістычная бацькаўшчына рабочай клясы. Пераможна вышаўшы з грамадзянскай вайны, полк ужо на працягу 7 гадоў з пяменным посьпехам вяніць далейшае сацыялістычнае будаўніцтва. Стоячы каля мяжы, пільна сачыць ён за ўсякімі дзеяньнямі ворагаў, якія ладаюць яшчэ адзін раз напасьці на нас. ваёй упартай вучобай, якая ўсё больш вялічваецца з году ў год, адказвае полк на выпады ворагаў. Наша 9 гадавіна асабліва выдзяляецца з усяго мірнага жыцьця полка, бо яна праходзіць у час нашых ольных посьпехаў і ў час асаблівых нападаў капіталу, а гэта патрабуе ад нас ільшай напружанасьці сіл, большай ранасьці справе працоўных. Пройдзеная оба за 9 гадавіну палка дае нам упэўненасьць, што цяперашнія байцы палка, нашчыкі радашковічаўскіх і брэст-літоўскіх гэрояў, ведаюць сваю задачу і добра падрыхтаваны да сустрэчы новых іспытаў у барацьбе за заваёвы Кастрычніка.

Полк добра правёў збор навабранцаў, збор пераменнага складу, спаяннай моцнай часткай паказаў сябе на мінулых манэўрах.

Шчыра вітаючы ўвесь кадравы, пераменны склад з дабм 9-й гадавіны палка і яго палкавым сьвятам, ЗАГАДВАЮ: за 10-ы год яшчэ больш павялічыць баяздольнасьць палка праз узмацненьне дысцыпліны, пашырэньне вучобы як начальнічага, так і радавога складу. Асаблівай задачай стаўлю пашырэньне сувязі кадра палка з пераменным складам і павялічэньне спайкі паміж камандным і радавым складам.

Усяму камандному складу, грунтуючыся на баявых рэвалюцыйных традыцыях палка, сустрэць і выхаваць новы маладняк, які ўвальецца ў полк, перадаўшы яму ўсё мінулае вялікае, чым так багаты гістарычны шлях палка.

З вераю ў канчатковую перамогу працоўных сьмела на 10 год! За дысцыпліну! За баяздольнасьць!

Няхай жыве 4 Чырвонаштандарны полк!

Няхай жыве камуністычная партыя, пад кіраўніцтвам якой полк гэраічна змагаўся і будзе змагацца за справу прапоўных.

Камандзір палка **СКУГАРАЎ**
Часовы камісар **СТАЛЯРЧУК.**
Начальнік штаба **ГАЎРЫЛАЎ.**

# Ад Менску да Ўладывастоку

## ІРКУЦК.

Нейкі журналіст газэты «Савецкая Сібір», пішучы аб адным з гарадоў Сібіры ў № 153 гэтай газэты, даводзіць літаральна наступнае: «От пустынных улиц Енисейска, населенных ныне «бывшими людьми» и мелкой шпанкой, до кривых закоулков Сити—какой размах».

«Размах», магчыма, і вялікі, але пашто-ж абражаць людзей, сьцьвярджэньнем, што ўсе жыхары Енісейску альбо «бывшие люди» альбо «мелкая шпана».

Мы вось ня робім гэткага сьцьвярджэньня да нашых суседзяў па вагону, ня гледзячы на тое, што, падʼяжджаючы пад Іркуцк, у нашым вагоне нейкія грамадзяне шмат каго абакралі.

Мы сьпім спакойна, бо папярэдзілі суседзяў аб тым, што, апрача беларускай літаратуры, у нас нічога больш няма, папярэдзілі і аб тым, што чаманы нашы цяжкія і гэткім чынам грамадзянам, якія вас пазбавяць ад іх, прыдзецца доўга пакутваць...

Наша агітацыя, здаецца, знайшла сабе пачэснае месца ў сярцох нашых суседзяў, бо раніцою мы з чамаданамі ў руках выходзілі з вагону.

Іркуцк—адзін з найбольш старых і буйных гарадоў Сібіры. Зазнаваны ён яшчэ ў 1652 годзе, а ў 1669 годзе Іркуцк ужо пачаў адбудоўвацца: у ім былі пабудаваны дзьве драўляныя крэпасьці, на якія, крыху пачакаўшы, і напалі буряты, але як кажа гісторыя Іркуцку, бяз выпікаў. У 1879 годзе стары драўляны Іркуцк выгараў і на яго месцы пачаў расьці новы двухпавярховы горад.

Гэткім мы яго і засталі па праезьдзе.

Самая прыгожая ў Іркуцку—гэта рэчка Ангара. Па сваёй быстрыні і празрыстасьці гэта рэчка непасрэдная процілегласьць нашай Сьвіслачы, хоць сталы мост пабудаваць праз Ангару відаць гэтак-жа цяжка, як і ў нас, бо і да гэтага часу мост праз Ангару—понтонны. Прыгожа глядзець на ланцугі, якімі трымаецца мост, праз аквамарынавыя воды Ангары яны відны на працягу некалькіх сажняў глыбіні.

Нічога падобнага я не наглядаў, калі глядзеў на Сьвіслач праз дзіркі на нашым мосьце.

Быстрыня Ангары 8-12 вёрстаў у гадзіну.

Стой, Сьвіслач, ня рушся!..

Побач, тут-жа бяжыць левы прыток Ангары—Іркут.

Да ўтоку ў Ангару, Іркут на працягу 120 вёрстаў прабівае сабе шлях сярод глыбокіх і вузкіх каменных скал, сярод вялікіх лясістых гор.

Сьцены скал складаюцца з гранітаў, сіенітаў, дзіёрытаў. У гэтых каменна-гранітных сковах Іркут бяжыць да Ангары, прабіваючы на сваім шляху вялікія схолы Мунка-Сардыка і Гунькінскіх Альпаў.

У процілегласьць ад Ангары вада Іркута мае шэра-зеляноваты колер горных рэчак, якім даюць сілу лёдавікі.

Ангара і Іркут—гэтыя дзьве рэчкі ўпрыгожваюць надворны Іркуцк. . .

. . . . . .

. . . . . .

Неяк у вагоне мы ехалі з адным чужаземцам.

Цікавы яго погляд на гэтую краіну.

Чужаземец сказаў:—«Тут у вас такія багацьці, што дзе ні чарпні лапатаю, дык калі ня руду, дык золата знойдзеш!»

І сапраўды, у адным Іркуцкай акрузе вы можаце знайсьці і золатаносныя россыпы, і каменны вугаль, і жалезную руду, і саляныя месцароды, і сялітравыя гразі, і мінэральныя воды, і агнятрывалую гліну, і тачыльны камень, і мармур, і налявы шпат, малінавага колеру, зьмеявік, тальк, хондрадзіт, лаўравіт, ружовы кварц, саліт, байкаліт, трэмаліт, чорны шорсі, чорную сьлюду, зялёны апацыт, нэфрыт, ды і шмат іншага.

У Іркуцкай акрузе Хацімская фарфаравая фабрыка адзіная ў Сібіры.

У Іркуцкай акрузе цудоўнай якасьці гліны, залежы ізумрудраў і славуты «Кузбас».

У Іркуцкай акрузе працуе $^1/_3$ частка ўсіх рабочых Сібіры.

Баечная па сваіх багацьцях краіна.

**А. Вольны.**

# Янка Купала вярнуўся дамоў.

На гэтых днях вярнуўся ў Менск з падарожжа па Заходняй Эўропе беларускі народны паэта Янка Купала. У гутарцы з нашым супрацоўнікам Янка Купала паведаміў наступнае:

Я. Купала.

— У Заходнюю Эўропу я паехаў, галоўным чынам, хячыцца і правёў паўтара месяца ў Карльсбадзе (Чэха-Славакія).

Мне давялося спаткаць там нашых пісьменьнікаў: Гартнага, Чарота і Заяцкага. Усе разам мы паехалі ў Прагу, дзе былі вельмі шчыра і ветла спатканы навуковымі і літаратурнымі коламі. Прафэсары Адоль Чэрны і Мурка мелі з намі гутарку, прычым вельмі цікавіліся станам сучаснай беларускай культуры. Некаторыя праскія газэты зьмясьцілі нашы фатаграфіі, гутаркі з намі і інш.

З Прагі Гартны, Чарот і Заяцкі накіраваліся ў Парыж, адкуль праз Бэрлін і Рыгу маюць хутка вярнуцца ў БССР. У Латвіі нашы пісьменьнікі маюць намер быць з візытам у латвійскага міністра асьветы Райніса і наведаць Дзьвінскую беларускую гімназію.

— Ці давялося вам пабываць у Заходняй Беларусі?

— Не,—адказаў Янка Купала.— Едучы назад, я спыніўся толькі на кароткі час у Варшаве і амаль нікога не спаткаў з беларускіх дзеячоў Заходняй Беларусі.

# Дзяржаўны бюджэт БССР на 1927-28 год.

## (У САВЕЦЕ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ).

Савет Народных Камісараў БССР на пасяджэньні за 19-24 верасьня г.г. прыняў праэкт дзяржаўнага бюджэту на 1927-28 год. Балянсавая сума бюджэту, паводле гэтага праэкту, вызначаецца ў 63,1 млн. руб. з ростам супроць бюджэту мінулага году на 17,6 проц.

Што датычыцца асобных частак бюджэту, то агульная сума падаткаў прынята ў 20,001 тыс. руб., на 8,5 проц. больш, як у папярэднім годзе. Калі ўзяць пад увагу зьніжэньне цэн, якое рабілася ў 1926-27 годзе і будзе рабіцца ў далейшым, то мяркуемае на 1927-28 г. некаторае павялічэньне падаткаў ні ў якім выпадку не павялічыць цяжкасьці абкладаньня насяленьня рэспублікі. Адзіны сельска-гаспадарчы падатак вылічаны з павялічэньнем супроць назначэньняў папярэдняга году на 3,3 проц. Ня гледзячы на некаторы рост сумы падаткаў, удзельная вага сельска-гаспадарчага падатку ў агульнай суме простых падаткаў зьніжаецца з 48,6 проц. у бюджэце 1926-27 году да 46 проц. у бюджэце 1927-28 году.

Непадатковыя даходы ў бюджэце 1927-28 году, у параўнаньні з 1926-27 годам, паказваюць некаторае зьніжэньне.

Гэта выклікана, галоўным чынам, памяншэньнем лясного даходу ў выніку паніжэньня такс і скарачэньня колькасьці і якасьці лясных плошчаў, якія мяркуецца перадаць у зямельны фонд. Тым ня менш непадатковыя даходы ў бюджэце 1927-28 году, як і ў бюджэтах мінулых гадоў, займаюць галоўнае месца, складаючы 56,7 проц. агульнай сумы ўласных даходаў Рэспублікі (ня лічачы адлічэньняў ад агульна-саюзных паступленьняў гэрбавага збору).

Ня гледзячы на магчыма поўнае скарыстаньне ўласных (тэрытарыяльных) прыбытковых крыніц, прыбыткі ад аношніх не пакрываюць неабходных і бязумоўна неадкладных выдаткаў, у выніку чаго СНК узьнята хадайніцтва аб асыгнаваньні нехапаючых сродкаў за лік павялічэньня адлічэньняў ад агульна-саюзнай сумы гэрбавага збору. Адначасна СНК узьняў хадайніцтва перад Саюзнымі органамі аб прыняцьці на агульна-саюзны бюджэт фінансаваньня мерапрыёмстваў, маючых агульна-саюзнае значэньне: маліорацыйных работ і пабудоўкі будынку Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту.

У выдатковай частцы праэктам бюджэту на 1927-28 год прадугледжваецца значнае павялічэньне выдаткаў на здаволеньне вытворчых патрэб народнай гаспадаркі Рэспублікі. Так, выдаткі на фінансаваньне народнай гаспадаркі павялічаны на 54 проц. і ўстаноўлены ў суме 23,1 млн. р.

Асабліва павялічваюцца выдаткі на прамысловасьць, асыгнаваньне на якую запраэктавана на 131,9 проц. больш, як у папярэднім годзе і дасягаюць 8,8 млн. руб. Таксама павялічаны і выдаткі на сельскую гаспадарку, па фінансаваньні якой вызначаецца павялічэньне на 36,8 проц. Выдаткі на сацыяльна-культурныя патрэбы павялічваюцца на 11 проц., а выдаткі адміністрацыйна-кіраўнічыя скарачаюцца на 50 проц. у параўнаньні з 1926-27 годам.

Такім чынам, прыняты СНК праэкт бюджэту на 1927-28 год яскрава адбівае выказаную на зьезьдзе саветаў волю працоўных, а разам з гэтым вынікі мерапрыёмстваў ураду БССР на патаненьні дзяржаўнага кіраўніцтва і ўзмацненьні ўкладаньняў у народную гаспадарку наогул і ў прамысловасьць—у прыватнасьці.

Прынятыя СНК БССР лічбы пры зацьверджаньні адзінага дзяржаўнага бюджэту Саюзу, магчыма, будуць некалькі зьменены. Але агульны кірунак бюджэту 1927-28 году ня зьменіцца. Захаваньне гэтага кірунку ў далейшым будзе залежыць ад таго, як будуць выконваць усе ведамствы і ўстановы новы бюджэт. Паводле пастановы СНК увага ведамстваў павінна быць накіравана: 1) на сваячасовае і поўнае выкананьне прыбытковай часткі; 2) скарыстаньне сродкаў выключна па іх беспасрэдным прызначэньні; 3) на замацаваньне вынікаў, якія былі дасягнуты ў галіне рацыяналізатарскай работы і патаненьне кошту утрыманьня дзяржаўнага апарату і 4) на строгую плянавасьць, сваячасовасьць максымальнае скарачэньне тэрміну і патаненьне кошту вытворчасьці пры адначасовым павялічэньні якасьці работ у галіне капітальнага будаўніцтва.

# Гомель у агульным імпорце БССР.

Яшчэ ў першыя гады існаваньня органаў замежнага гандлю Беларусі апошнія мелі нічыльныя гандлёвыя зносіны з вытворчымі аб'яднаньнямі Гомельшчыны. За гэтыя гады часткова выконваліся імпортныя пляны Палескага напяровага трэсту, Палескага сярніковага трэсту і інш.; ім дастаўлялася, галоўным чынам, сыравіна і абсталяваньне. Таксама развівіваліся гандлёвыя зносіны з гандлёвым органам Гомельскага губэрскага СНГ-Палесгандлем па дастаўцы для прамысловасьці Гомельшчыны інструментаў і розных дапаможных матар'ялаў. Аднак, у зьвязку з адбыўшымся ў 1926 г. раёнаваньнем апарацый па замежным гандлі, гандлёвыя зносіны Дзяржгандлю з Гомельшчынай не маглі далей разьвівацца.

Як толькі далучэньне Гомельшчыны да Беларусі было аформлена, Белдзяржгандаль пачаў выяўляць імпортныя патрэбы Гомельшчыны ў мэтах плянавай дастаўкі імпорту. З прычыны таго, што да канца 1926-27 году імпортныя кантынгэнты Гомельшчыны былі згрупаваны ў цэнтры, Белдзяржгандаль ня меў ніякай магчымасьці ўдзяліць Гомельшчыне больш-менш значнай партыі імпартных тавараў.

Належыць толькі адзначыць наступныя заказы, выкананыя для Гомельшчыны: дастаўлена сыравіна і часткі машын для сярніковых фабрык „Везувий" і „Днепр"; мэталёвым заводам дастаўлены: каляровыя мэталы, некаторыя інструманты і дапаможныя матар'ялы. Выпісаны некаторыя машыны для апрацоўкі мэталю для дзяржаўнай цукерні, розная сыравіна для гэтай фабрыкі (какава-бабы, цытрынная соль і інш.). Мае паступіць партыя шаўро, прызначная выключна для Гомельшчыны. Вядуцца перамовы з Гомельскім Акрвыканкомам аб утварэньні договору на дастаўку аўтобусаў маркі „Штэйер", якія ў хуткім часе маюць быць атрыманы з Аўстрыі.

Пачынаючы з новага 1927-28 апэрацыйнага году, дастаўка Гомельшчыне імпортных тавараў канчаткова пераходзіць да Беларусі. Па плану прадугледжан увоз абсталяваньня для паступных галін прамысловасьці: па мэталёвай,—для машынабудаўнічага заводу „Пролетарий", а таксама машыны для Рэчыцкага заводу па вырабу цыкіоў. Праэктуецца дапасаваць завод для масавага вырабу шрубаў для дрэва, абсталяваньне на значную суму для сярніковых фабрык, машыны для механізацыі фабрыкі абутку „Труд", апроч рознай сыравіны і дапаможных матар'ялаў для ўсіх галін дзяржаўнай, працалектыўнай і саматужнай прамысловасьці.

**А. Р-р.**

# Ад лютага да Кастрычніка.

*(Хроніка гістарычных падзей).*

**28 верасьня (11 кастрычніка).**

— Пасяджэньне ВК Петраградзкага С.Р і С. Д., у якім прыняла ўдзел дэлегацыя ад Краштадзкага Савету Р. і С. Дэпутатаў. Дэлегацыя гэта абʼехала гарады—Гэльсінгфорс, Парву, Рэвель і інш., дзе ўзьнімала пытаньне аб неабходнасьці вызваленьня краштадцаў, арыштаваных пасьля 3-5 ліпеня. Дэлегацыя адзначыла, што краштадцаў затрымліваюць у зьняволеньні ў той час, як іншых арыштаваных выпускаюць.

В. Камітэт прыняў наступную рэзалюцыю: „Прымаючы пад увагу, што трыманьне пад вартай мае сэнс толькі тады, калі існуе небясьпека магчымасьці ўхіліцца ад сьледзтва і суда, і лічачы, што паручыцельства цэлага шэрагу Саветаў Р. і С.Д. зьяўляецца выстарчальнай гарантыяй,—ВК Петраградзкага Сав. Р. і С. Д. далучаецца да патрабаваньня Краштадзкага Савету Р. і С.Д. аб вызваленьні з-пад варты затрыманых на справе 3-5 ліпеня.

— Адбыўся агульны сход паштова-тэлеграфных служачых, на якім прынята рэзалюцыя з выражэньнем недавер'я

## Праезд міжнароднай дэлегацыі па ўпарадкаваньні чыгуначных зносін.

Учора ў 2 гадзіны ночы праз Менск у Маскву на спэцыяльную міжнародную нараду праехала аб'ядная аўстрыйска-вэнгэрска-польска-чэха-славацкая дэлегацыя ў ліку 9 чалавек. Усе дэлегаты прымалі ўдзел у працы міжнароднага кангрэсу ў Брэсляўлі. Разам з дэлегатамі праехаў намесьнік упаўнаважанага па міжнародных зносінах пры НК шляхаў СССР тав. Баброў. У Маскве дэлегацыя мае абмеркаваць пытаньне аб упарадкаваньні простых чыгуначных пасажырскіх і таварных зносін між СССР, Аўстра-Вэнгрыяй, Чэха-Славакіяй і Нямеччынай транзітам праз Польшчу. Дэлегацыя мае абмеркаваць таксама і пытаньне аб зьніжэньні чагуначнага тарыфу.

## Праезд пэрсыдзкіх студэнтаў.

Учора у 2 гадзіны ночы праз Менск у Маскву праехалі пэрсыдзкія студэнты ў ліку 12 чалавек. Студэнты скончылі ў Парыжы розныя вышэйшыя навучальныя ўстановы і накіроўваюцца на бацькаўшчыну. У Маскве яны маюць затрымацца на некалькі дзён, дзе ў гэты час пазнаёмяцца з пастаноўкай працы ў ВНУ.

# Вёска сёньня.

## На жаночых сходах.

### Жанчына зразумела свае задачы.

3-га кастрычніка адбыліся перавыбары дэлегатак у м-ку Пагост. На сход сабралася каля 100 жанчын. З вялікай увагай сход заслухаў даклад сэкратара партыйнай яч. аб міжнародным становішчы. Са спрэчак выявілася, што вясковая жанчына ўжо зразумела свае задачы ў зьвязку з абаронай краіны.

Выказалася каля 10 жанчын. Усяго абрана 20 новых дэлегатак. Быў зачытан наказ дэлегаткам у іх далейшай працы. Трэба чакаць, што пры належным кіраўніцтве працы дэлегацкага сходу ў Пагосьце дасьць добрыя вынікі.

**Н. Д.**

*М-ка Пагост, Бярэзінскага раёну, Менскай акругі.*

### Пад знакам актыўнасьці.

Дзень раённага зьезду сялянак-актывістак зьяўляецца выдатным днём у жыцьці нашай сялянкі. Ён яскрава паказаў, што за апошнія 10 год наша сялянка вырасла, як сьвядомы працаўнік нашай вёскі. Не ня толькі цікавіць прасьніца і печ (як яшчэ кажуць некаторыя несьвядомыя сяляне), а палітычныя і гаспадарчыя пытаньні нашай краіны. Аб гэтым сьведчыць тая актыўнасьць, з якою былі абгавораны пытаньні зьезду: аб міжнародным і ўнутраным становішчы і нашы дасягненьні ў савецкім будаўніцтве і ўдзел сялянак у іх.

21 чалавек выступаўшых у спрэчках—гэта ня часта можна наглядаць і на сходах сялбрэ саюзаў і на сходах, дзе пераважна прысутнічаюць мужчыны.

—Шырэй разгарнуць працу па ўцягненьню жанчын-сялянак у шэрагі Осоавіяхіму і ваенізацыі сялянак.

— Часьцей склікаць сходы сялянак з нас яшчэ сьмяюцца несьвядомыя мужчыны, калі мы ідзём на сходы, кажуць дэлегаткі зьезду.

— Больш чырвоных куткоў у вёсках і літаратуры для іх.

Цікавяцца жанчыны і справамі капэрацыі, і чаму яшчэ дарагія падручнікі для школ, і падаткам, і школьнымі справамі, і шляхавым будаўніцтвам. Няма ніводнае галіны гаспадарчага жыцьця райёну, аб якой ня выказваліся-б дэлегаткі зьезду.

Усё гэта паказвае, што жанчыны-актывісткі моцна непакояцца тым, каб наладзіць гаспадарку райёну.

Добра ведаюць жанчыны, што наладзіць гаспадарку райёну можна толькі ў спакойных абставінах. Вось чаму яны кажуць у сваёй рэзалюцыі па першаму пытаньню, што «жанчына стане ў шэрагі барацьбітоў за сацыялістычную бацькаўшчыну, калі буржуі памкнуцца ваяваць з намі». Можна спадзявацца, што сялянкі выканаюць гэтую пастанову ца дзеле, у чым парукай актыўнасьць зьезду.

Зьезд закончыўся абраньнем 8 дэлегатак на акруговы зьезд і сьпевам беларускай марсэльезы. **Б. К-ч.**

*Слуцкі раён Бабруйшчына.*

## Палёгкі беднаце.

2 кастрычніка адбыўся пленум В. Крушынаўскага сельсавету, на якім разгледжаны шэраг пытаньняў гаспадарчага і культурнага будаўніцтва вёскі. Сёлета лес даваўся толькі тым, каму ён запраўды патрэбен і не на пню, як летась, а на поўны будынак. Даны льготы 32-гаспадаркам на суму 176 р. 65 кап. па падатку і 45 гаспадаркам па страхоўцы. Урэшце разгледзілі пытаньне аб устаноўцы тэлефону ў с-с. для сувязі ў РВК.

**Я. М. Савіцкі.**

*в. В-Крушынаўка Рагачоўскага р-ну, Бабр. акр.*

## Як выплачваецца с.-г. падатак.

Раздача акладных лістоў сёлета ў нас была са спазьненьнем,—раздалі іх 2 кастрычніка. Глянуўшы на новыя лісты, насельніцтва рознае кажа наконт падатку. Беднякі і частка серадняку кажуць:

— Падатак лягчэйшы і больш-менш справядлівейшы, чымся ў мінулым годзе.

Кулакі і частка серадняку кажуць: «цяжэйшы».

— Хай беднякі плоцяць, а мы не дадзім.

Але, наогул кажучы, калі разабрацца, то новы падатак усёж-такі лягчэйшы і справядлівейшы, чымсь у мінулыя гады. Гэта падкрэсьліваецца тым, што бывала гаспадары неахвотна выплачывалі, а сёлета бачым інакш. За кароткі час унесена 200 руб. Гэта ўнесла 25 гаспадароў - беднякоў і сераднякоў.

**Зух.**

*Сьмілавіцкі раён, Рудзенскі с.-с.*

## Юрыдычная дапамога.

У красавіку месяцы ў нас, у Краснаўках адчыніўся і працуе штодзённа пры хаце-чытальні «даведачны стол», які аказаў за гэты кароткі тэрмін насельніцтву не малую карысьць. За гэты час даведачны стол наведала: 133 мужчыны і 33 жанчыны. Напісана заяў па дных толькі крымінальных справах 14 штук і дадзена парад 4. Па грамадзянскіх справах заяў 20, парад—5. Па адміністрацыйных—заяў 23, парад—3. І іншых напісана 61 заява і дана 6 парад. Ды па зямельных справах напісана 43 заявы і дадзены 3 парады.

122 чалавекам былі дадзены даведкі зусім дарэмна, рэшта за невялічкую плату ад 10 да 30 капеек за даведку.

Гэтыя грошы ідуць на абсталяваньне даведачнага стала, на закупку пісьмовых прылад і паперы і на закупку належнае юрыдычнае літаратуры.

У апошнія дні адчуваецца вельмі вялікі наплыў насельніцтва ў даведачны стол пры хаце-чытальні.

**Рыгор Лапіцкі.**

*Краснаўкі, Халопеніцкага р.*

## Не ўдалося!

Яшчэ з часоў перавыбараў сельсавету гр-нін вёскі Забалоцьце, Мурашка Пётра Паўлаў, стараўся як-небудзь прабрацца у сакратары ці нават і ў старшыні с.с.,

Калі-ж не ўдалося яму пралезьці ў прэзыдыум (членам с.с. яго выбралі), дык ён пачаў буяць, пісаць у адпаведныя ўстановы аб тым, што перавыбары прайшлі няправільна.

Аднак, і ў другі раз ён не пралез ды яшчэ ўсё сялянства за гэта на яго абурылася.

Пасьля ўсяго гэтага Мурашка Пётра астаўся усёж-такі членам с.с. з затаёнай злосьцю і помстай на ўсіх, і горача «абараняў» сваю забалацкую беднату.

„Абарона" яго зараз-жа выявілася. Па паданай у РВК заяве нялаўна прыехаў у Кляніцкі с.с. загадчык грашовай часткі РВК т. Гаўрык і разам з членам РВК т. Розенманам і старшынёй с.с. паехалі ў в. Забалоцьце і там **толькі ў 10 гаспадароў (у тым ліку і гаспадарка члена с.с. Мурашкі Пятра) выкрылі 21 штуку рагатай жывёлы.**

Аказалася, што член с.с., які ў свой час праяўляў „актыўнасьць", ня толькі ў сябе ўкрыў ад вучоту аб'ектаў жывёлу, а навучаў гэта зрабіць нават усіх сваіх дзядзькоў.

Цяпер-жа, ня гледячы на гэта, Мурашка дамагаецца як-небудзь папасьці ў сэкратары с.с., хаця пралетарскі суд яму павінен яго сапраўднае мейсца скора вызначыць і прымусіць заняць. **М. ЯЗЬМІН.**

*Кляніцкі с.с., Смалявіцкі р.*

# Аб чым гавораць каменьні.

### Археолёгічныя раскопкі т. Сэрбава.

Археолёг Сэрбаў, які выдаўна вярнуўся з археолёгічнай экспэдыцыі, паведаміў нашага супрацоўніка аб цікавых археолёгічных знаходках, выяўленых пры раскопках старажытнага гарадзішча на р. Ухлясьці і поля пахавальных вурнаў каля Нова-Быхава.

Старажытнае гарадзішча на р. Ухлясьці (лева прыток Дняпра) мае форму ўсечынага конуса абведзенага 2 глыбокімі роўчакамі і высокім валам.

Верхняя пляцоўка мае форму эліпса і займае на доўгай восі 28, а па кароткай—25 сажн. Агульная вышыня гарадзішча досягае 7 сажн. У ніжнім пласту гарадзішча, які складаецца з каменьняў і перагарэлай зямлі, знойдзены ачагі, косьці кароў, сьвіней і інш.

Па меркаваньні тав. Сэрбава, гэта гарадзішча (як і гарадзішча на р. Блаздынцы, Пскоўскай губ.) адносіцца да вельмі старажытнай эпохі і захоўлівае пэрыяд літоўскі, а мажліва, і фінскі (гарадзішча на Блаздынцы яўна фінскага характару). Можна дапусьціць што народы да-славянскага пэрыяду набудавалі гэта гарадзішча для абароны. Шмат рознага чарэпʼя і каменьняў сьведчаць аб тым, што ў гарадзішчы надтрымліваўся пастаянны агонь, што зьвязвае ўхлясьцінскае гарадзішча з культам літоўскага бога Зьніча.

На правым беразе р. Ухлясьці захаваласі месца старажытнага селішча з ямкамі ад былых агнёў. Пры ўскрыцьці ў ямках знойдзены астаткі ачагоў з каменьняў і астаткі гліняных пасуды таксама гарадзішчынскага тыну, але па форме вырабу іх можна скарэй аднесьці да славянскай культуры.

* * *

Каля Нова-Быхава тав. Сэрбаў ускрыў невялічкі плян могільніка з вурнавым пахаваньнем, дзе знойдзены да 12 месц пахаваньняў, прычым 6 пахавальных вурнаў удалося дастаць цалкам.

Апошнія досьледы выявілі характар старажытнага пахаваньня: труп спальвалі на месцы на моцным агні, пасьля з попелу выбіралі частку касьцей і тут жа на аддалёгласьці 15-20 сант. складалі ў невялікую ямку, а наверх ставілі вурну, куды таксама клалі косьці нябожчыка.

Вурны маюць форму вазоньніка бяз кружала, зробленыя з гліны, зьмешанай з дрэсвай (цёрты камень).

Сёлета знойдзена вельмі цікавая вурна з рубчыкам, што зьвязвае гэтую вурну з культурай славян. У апошний сярод касьцей знойдзена гліняная прасьліца (пакшталт гліняная грузіла, якое і цяпер ужываецца пры сецях), што сьведчыць аб пахаваньні жанчыны.

Нова-Быхаўскае поле пахавальных вурнаў ня мае аналёгіі з гэткай самай культурай, якая назіраецца па сярэднім Дняпры (досьледы Хвойкі) і ў Прывісьлінскай краіне (досьледы Самаквасава і польскіх археолёгаў).

З гэтага можна зрабіць вывад, што апошняя культура адносіцца да пэрыяду дакуганнай культуры і скарэй усяго захоўлівае першую пару паяўленьня тут славян.

Га аўтабел 24684.

# Уся ўвага—індустрыялізацыі краіны.

## Агульнымі высілкамі працоўныя паставяць індустрыялізацыю СССР на моцныя рэйкі.

## Больш плянавасьці ў распаўсюджаньні пазыкі індустрыялізацыі

Тыя данныя, якія мы маем за 6 дзён кампаніі па рэалізацыі пазыкі ў БССР, гавораць аб тым, што пачатак кампаніі праходзіць досыць пасьпяхова: у акруговых гарадох пачата калектыўная падпіска амаль на ўсіх прадпрыёмствах і ўстановах. Ёсьць прадпрыёмствы, дзе падпіска ўжо праведзена. Асноўная маса прадпрыёмстваў пачала праводзіць падпіску па пазыку, не чакаючы агульных сходаў і нават выдзяленьня камісій.

Можна сказаць, што пакуль што рэалізацыя праходзіць стыхійна. Гэта стыхійнасьць, зразумела, зьяўляецца станоўчым фактам; гэта гаворыць аб тым, што асноўная маса працоўных хутка зразумела вялікае палітычнае і гаспадарчае значэньне, якое партыя і савецкая ўлада надае гэтай пазыцы. Але гэта стыхійнасьць мае свае адмоўныя бакі: яна можа прывесьці да таго, што ў некаторых калектывах створыцца нядбалы настрой.

Можа здарыцца, што бяз плянавай растлумачальнай кампаніі мы ня будзем мець тых магчымых і патрэбных фінансавых вынікаў, якія мелі-б тады, калі-б кожнаму працоўнаму была падрабязна растлумачана мэта пазыкі і яе ўмовы.

Можа здарыцца, што будзе фінансавы эфэкт, але ня ўсе працоўныя будуць у належнай меры асьвядомлены, якая вялікая на бліжэйшы час роля дзяржаўных пазык у нашай народнай гаспадарцы, і якую вялікую дапамогу аказвае нашаму будаўніцтву кожны працоўны, купляючы пазыку, з адначасовай карысьцю для сябе.

Вось чаму асноўная задача дню ў справе рэалізацыі пазыкі гэта—**укласьці стыхійную рэалізацыю ў плянавыя арганізацыйныя рамкі**, для чаго неабходна:

1) неадкладна арганізаваць камісіі, дзе яшчэ іх няма; 2) праводзіць растлумачальную кампанію шляхам сходаў і гутарак; 3) ужыць усе захады для абхвату ўсіх 100 проц. працоўных; 4) шырока разгарнуць усю агіткампанію і падпіску менавіта зараз з пачатку кампаніі, калі да тэрміну першага ўзносу 3 разы будзе атрымана зарплата, бо ў канцы кампаніі рабочаму і служачаму прыдзецца ўвесь першы ўзнос рабіць адразу.

Трэба цьвёрда ўявіць сабе, што выпускаючы пазыку індустрыялізацыі на 200 мілёнаў рублёў—савецкая ўлада ставіць перад працоўнымі СССР дзьве задачы:—сабраць 200 міл. руб. на павялічэньне тэмпу нашага сацыялістычнага будаўніцтва і растлумачыць працоўным, што ў бліжэйшы час адной з асноўных крыніц для фінансаваньня будаўніцтва павінны быць і будуць—дзяржаўныя пазыкі, што працоўныя павінны будуць данамагчы нашаму будаўніцтву ня толькі сваёй працай, але і сваімі зьберажэньнямі.

**Абрамсон.**

## Як ідзе падпіска на пазыку індустрыялізацыі.

### ХТО І КОЛЬКІ ПАДПІСАЎСЯ.

- **Калектыў газэты «Савецкая Беларусь"** у колькасьці 20 чал. падпісаўся на 2.300 руб.
- **Белдзяржхарчтрэст**—з 62 супрацоўнікаў падпісалася 47 чал., на суму 1.240 р.
- **Дражджавы завод «Чырвоная Зорка»**—падпісалася 100 рабочых на суму 1.200 р.
- **Дражджавы завод „Пралетары"**—70 чал. падпісаліся на 1.400 руб.
- **Дражджавы завод „Варшаванка"**—80 чал на 800 р.
- **Камхоз**—12 чал. на 450 руб.
- **Працкалектыў парыкмахераў**—26 чал. на 240 руб.
- **Групком прыватных прадпрыёмстваў**—15 чал. на 600 руб.
- **Хімфарм завод**—33 чал. на 300 руб.
- **Шкляны трэст**—39 чал. на 1.645 р.
- **Завод „Беларусь"**—28 чал. на 198 р.
- **Саўгандфавт**—16 чал. на 350 руб.
- **Кантора скураных заводаў**—12 чал. на 180 руб.
- **Першы скураны завод**—35 чал. на 735 руб.
- **Другі скураны завод**—41 чал. на 160 руб.
- **Трэці скураны завод**—37 чал. на 495 руб.
- **Завод «Дрэваапрацовчнік»**—25 чал. на 375 руб.
- **Лесбел**—36 чал. на 2.075 руб.
- **Украінлес**—9 чал. на 190 руб.
- **Агразмаддзел**—24 чал. на 800 руб.
- **Белсельсаюз**—35 чал. на 675 руб.
- **Белсельтрэст**—30 чал. на 650 руб.
- **Цэнтральная рабочая амбулаторыя**—60 чал. на 1 900 руб.
- **Белкаапсаюз**—72 чал. на 1.500 руб.
- **Управа Дзяржгандлю**—71 чал. на 1.700 руб.
- **Галоўнае кіраўніцтва міліцыі**—60 чал. на 800 руб.
- **Белмэдгандаль**—49 чал. на 648 руб.
- **Цэнтральны дзіцячы дыспансэр**—20 чал. на 200 руб.
- **Дзіцячая клініка**—5 чал. на 125 руб.
- **Белпайгандаль**—46 чал. на 705 руб.
- **Белжылсаюз**—7 чал. на 150 руб.
- **ВСНГ**—60 чал. на 2.000 руб.
- **Наркамасьветы**—45 чал. на 450 руб.
- **ЦК КП(б)Б**—Усе супрацоўнікі падпісаліся. 80 чал. на 1.700 руб.
- **Камвуз**—51 чал. на 900 руб.
- **Архітэктурна-будаўнічы тэхнікум**—15 чал. на 225 руб.

### ХТО ЗУЗІМ НЕ ПАДПІСАЎСЯ.

- **Цэнтрасьпірт** пантора —не атрымала пікіх указтыньняў ад саюзу, і мясцкому прышлося самому самастойна ўзяцца за гэтую працу. Практычнага яшчэ нічога ня зроблена.
- Адвадушцамі Цэнтрасьпіртканторы зьяўляюцца цукерная фабрыка, мясцком мыкаапэрацыі, асенізацыйны абоз, завод «Чырвоны Хімік", спатабойня, Белпагруз, пратэзная майстэрня, Белдзяржстрах, 4-я саўбольніца, цэнтральная аптэка, Дзяржбанк, Ідрыанэзм. У апошнім абмежаваліся толькі тым, што даручылі зборшчыку сяброўскіх прафсэюзных аддікаў зрабіць падпіску.

## Значэньне транспартнай пазыкі.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам ўшаноўваканы Нар. Кам. Шляхоў пры СНК БССР паведаміў аб значэньні, якое мае выпушчаная транспартная пазыка.

У 1925-26 гаспадарчым годзе наш транспарт па колькасьці перавозак дасягнуў узроўню перавозак 1913 году. Але ў недалёкай будучыні наш транспарт можа аказацца ў такім становішчы, пры якім ён ня будзе мець магчымасьці абслугоўваць масу прадукцыі, прызначанай для перавозкі ў якасьці грузаў.

Транспарт для правядзеньня рэканструкцыі сваёй гаспадаркі патрабуе вялікіх сродкаў. Пазыка індустрыялізацыі пойдзе на іншыя галіны прамысловасьці. Праўда, транспарт атрымлівае ад дзяржавы ў 1927-28 годзе 300.000.000 рублёў,—у два разы больш, чым у 1926-27 годзе, але ўсё-ж-такі гэтых сродкаў замала для аднаўленьня транспартнай гаспадаркі. Транспарту, побач з узмацненьнем яго абсталяваньня і разьвіцьця чыгуначных вузлоў, неабходна прысьпяшыць будаўніцтва новых чыгунак. Узрост патрэбы ў сыравіне і апале патрабуе ўзмоцненага чыгуначнага будаўніцтва ў райёнах здабываньня гэтай сыравіны.

Да апошняга часу аднаўленьне і пашырэньне транспарту вялося за кошт прыбыткаў чыгункі і часткай за кошт дзяржаўнага бюджэту. Сродкаў гэтых было замала; аднак, транспарт, праўда, з вялікай напружанасьцю спраўляўся з ускладзенымі на яго задачамі. У далёшым, трэба сказаць, гэтыя крыніцы бязумоўна ня змогуць здаволіць патрабаваньняў транспарту.

З прычыны гэтага транспарт заняты цяпер думкай аб адшуканьні новых крыніц сродкаў. **У зьвязку з гэтым урад СССР дазволіў НКШ выпусьціць аблігацыйную пазыку ў суме 60.000.000 рублёў.**

Чыгуначныя пазыкі практыкаваліся яшчэ і ў дарэвалюцыйныя часы і, трэба сказаць, што яны карысталіся вялікай увагай насельніцтва. Разьвіцьцё чыгунак у дарэвалюцыйныя часы ішло, гатоўным чынам, за кошт гэтых пазык.

Найбольшыя ўкладаньні з пазыкі пойдуць на Туркестанска-Сібірскую лінію і Волга-Данскі канал.

Паколькі БССР зацікаўлена ў разьвіцьці чыгуначных шляхоў, трэба думаць, што і працоўныя Беларусі адносяцца ўважліва да транспартнай пазыкі.

# ХРОНІКА.

### Прывітаньні ЦВК БССР.

На імя Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР паступілі прывітальныя тэлеграмы: а) ад Аршанскага гарадзкога сходу жанчын, б) ад Мазырскага акруговага зьезду жанчын-грамадзкіх працаўніц, в) ад Бабруйскага акруговага зьезду работніц і сялянак-членаў саветаў і г) ад Аршанскага райённага зьезду жанчын, членаў саветаў.

### Сэкрэтар ЦВК БССР Хацкевіч вярнуўся з Масквы.

Учора вярнуўся з Масквы сэкратар ЦВК БССР і старшыня Нацкамісіі пры ЦВК БССР тав. Хацкевіч, які рабіў даклад у Савеце Нацыяльнасьцяў пры ЦВК СССР аб выніках беларусізацыі ў БССР.

### Падрыхтоўка да мастацкай выстаўкі.

Выставачны к-т па падрыхтоўцы ўсебеларускай мастацкай выстаўкі атрымаў з Сібіры ад аднаго мастака-беларуса тры скульптурныя працы.

Студэнты старшага курсу Віцебскага мастацкага тэхнікуму рыхтуюць да выстаўкі цэлы шэраг экспанатаў.

### Павялічэньне колькасьці літоўскіх школ.

У 1927-28 навучальным годзе Наркамасьветы адчыніў у Віцебскай акрузе 2 аднакамплектавыя літоўскія школы. Усяго у бег. навучальным годзе на тэрыторыі БССР будзе існаваць 11 аднакамплектавых літоўскіх школ.

### Беларусь—у Маскве.

Пры выстаўцы нацыянальнасьцяў у Маскве будзе арганізаваны беларускі пакар, на якім выступіць з дакладамі два лектары пра сучасны стан беларускага мастацтва і літаратуры. На гэтым вечары выступіць таксама беларускі хор, які прыедзе з Менску.

### Новы завод Белмэдгандлю.

Белмэдгандаль прыступае да пабудовы новага будынку для фармацэўтычнага заводу ў Менску. Пабудова будынку будзе каштаваць 180.000 руб. Для закупкі новага абсталяваньня для заводу адпушчана 20.000 руб. Новы завод будзе выпрацоўваць ня толькі фармацэўтычныя прэпараты а і хімічныя прадукты. Пабудова заводу закончыцца ў 1928-29 г.

### Колькі будзе завезена хлеба ў працягу кастрычніка.

Згодна вестак, плян адгрузкі хлебапрадуктаў для БССР у кастрычніку вызначан у наступнай колькасьці: жыта—250.000 п., жытняй мукі—250.000 пуд. і пшанічнай мукі—325.000 пуд.

### Новы будынак для станцыі Негарэлае.

Закончана пабудова будынку для станцыі ў Негарэлым. Канчаецца знадворнае абсталяваньне. Пры будынку зроблена разьбіўка клюмбаў для кветак. Будынак драўляны і пабудован у беларускім стылі.

### На карысьць бяспрытульных.

Белсельтрэст і ЦП саюзу працаўнікоў зямлі і лясу праводзяць на ўсіх савецкіх гаспадарках „Камсамольскі суботнік".

Актыўны ўдзел у гэтым „суботніку", апроч моладзі, прымаюць таксама і ўсе рабочыя савецкіх гаспадарак. Плата за працу ў часе «суботніка», у суме каля 5000—7000 руб., перадаецца цалкам на карысьць бяспрытульных.

### Тавары для каапэрацыі.

Менскі Цэрабкоп на днях атрымаў 3 вагоны селядцоў, 3 вагоны пшанічнай мукі, вагон бавоўняна-папяровай мануфактуры, значную партыю жалезных ложкаў і 3000 пар галёш. У бліжэйшыя дні мае паступіць вагон эмаліраванай пасуды; што датычыцца разьмеркаваньня мануфактуры, то недахватныя тавары будуць адпускацца толькі пайшчыкам.

## У Нар. Кам. Рабоча-Сял. Інспэкцыі.

### Рэарганізацыя падатковых вучасткаў.

Да гэтага часу ў кожным райёне існуе райфінінспэктар. Па вывучэньні працы райфінінспэктароў выявілася што існаваньне фінінспэктара ў кожным райёне немэтазгодна, з той прычыны, што нагрузка інспэктароў нізкая. Падругое гэта не дае магчымасьці ўкамплектаваць падатковы апарат працаўнікамі належнай кваліфікацыі. Утрыманьне апарату каштуе дорога.

Прымаючы на ўвагу гэтыя прычыны, калегія РСІ лічыць неабходным:

1) Устанавіць на тэрыторыі БССР сыстэму ўзбуйненых падатковых вучасткаў, замест існуючых сельскіх падатковых інспэкцый.

2) У аснову рэформы сыстэмы падатковых вучасткаў пакласьці ўказаньні НКФС СССР.

3) НКФС БССР тэрмінова распрацаваць і правесьці ў адпаведным парадку сетку і штаты ўзбуйненых вучасткаў з такім разьлікам, каб узбуйненьне выканаць у месячны тэрмін.

4) У сувязі з узбуйненьнем, НКФС Бел. зрабіць адпаведныя зьмены ў палажэньні аб райфінпадатковых вучастках, а таксама і іх правох.

5) Пытаньне аб узбуйненьні тэрмінова паставіць на разгляд і зацьверджаньне СНК БССР.

### Справа Заходняга аддзяленьня „Тэжэ".

На дзейнасьць Заходняга аддзяленьня «ТЭЖЭ» РСІ СССР зьвярнула сваю ўвагу яшчэ ў 1926 г.

У працы аддзяленьня назіраецца шэраг ненармальнасьцяй—залішне раздуты штат, вялікія выдаткі на разьезды і г. д.

РСІ дасканала дасьледвала працу аддзяленьня і на насяджэньні калегіі пастанавіла:

скараціць накладныя выдаткі да 1,5 пр., заместа 3 проц., і скараціць выдаткі на разьезды;

загадчыка аддзяленьня т. Штэля за невыкананьне прапаноў РСІ прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці, перадаўшы справу Пракурору Рэспублікі.

Прасіць ЦКРСІ СССР аб прыцягненьні да адказнасьці праўленьне „ТЭЖЭ" за невыкананьне пастановы РСІ аб скарачэньні штатаў у Заходнім аддзяленьні.

## Да перавыбараў фабкому.

(Рабфак БДУ).

На днях склікаецца агульны сход рабфакаўцаў, на якім будуць заслуханы справаздачныя даклады факультэтацкага камітэту, рэвізійнай камісіі, а затым адбудуцца і самыя перавыбары. Студэнцкія масы рабфаку павінны належна абгаварыць працу старога факому і рэв. камісіі, прычым зьвярнуць асаблівую ўвагу на хібы, якія налічваецца шмат за сучасным факомам.

Факом не зьяўляецца выяўленцем грамадзкай думкі ўсіх студэнтаў рабфаку. Гэтае погляд у многіх студэнтаў, у зьвязку з чым перад новым факомам стаіць заданьне—бяць на варце інтарэсаў студэнтаў. Новы факом павінен зьвярнуць увагу на тое, каб дапамагчы студэнтам матар'яльна, хоць-бы воднускам дармовых білетаў у баню. Таксама трэба зьвярнуць увагу на харчаваньне студэнтаў, на зьнішчэньне сталянак у чарзе ў сталоўцы і г. д.

Наогул, студэнты павінны добра прадумаць, каго яны павінны выбраць у сваю грамадзкую арганізацыю—факому.

Рабфакавец **Цітаў В.**

## Радыё на чыгунцы.

### Радыё-тэлефоны ў паяздох МБВ чыгункі.

Думка аб ужываньні радыё-тэлефонаў у паяздох ажыцьцяўляецца. Зараз ужо робяцца вопыты тэлефаніраваньня ў паяздох на ходу. Гэтымі днямі аддзел сувязі і электратэхнікі МБВ чыгункі закончыў такія вопыты на вучастку **Менск—Масква**. Вынікі аказаліся найлепшымі.

У двух вагонах аддзел устанавіў перадатчыкі ў 50 вольт і прыёмнікі. На страхах вагонаў пастаўлены невялікія антэны. Пры тэлефаніраваньні на ходу на аддлегласьці кали 120 кілёмэтраў чуваць было так, нібы ў звычайных гарадзкіх тэлефонах.

У недалёкім часе аддзел сувязі і электратэхнікі МБВ чыгункі мяркуе ўвесьці рэгулярнае карыстаньне тэлефонамі на паяздох.

### Радыё на таварных паяздох.

Амэрыканскія таварныя паязды дасягаюць у даўжыню да паўтара кілёмэтра. Для хуткіх зносінаў машыніста з галоўным правадніком, што едзе ў апошнім вагоне, у якім знаходзіцца дадатковая сыстэма аўтаматычных тармазоў на выпадак трывогі, на поезьдзе абсталёвана радыё. Радыё працуе на кароткай хвалі, каб ухіліцца ад перашкодаў з боку розных радыёстанцый.

Да гэтага часу трывожныя сыгналы з аднаго канца поезда ў другі перадаваліся сьвісткамі або сыгнальнымі флагамі, але гэта не заўсёды давала станоўчыя вынікі. Радыёперадача ў паяздох можа быць ужита пры саставах ад 75 да 125 вагонаў. Перад перамовамі машыністу, або правадніку досыць націснуць спэцыяльную кнопку, а затым пачуецца рэзкі шум, які нельга не пачуць.

# СУД.

### ЗАБІЎ «ЗЛОДЗЕЯ».

Базыль Касьцючэнка сярод белага дню вышаў на панадворак і адразу нешта ўсачыў каля стагоў сена.

— Ага... Урэшце злавіў такі,—вырвалася ў яго.

Нічога ня думаючы, Базыль набег да стагоў. Адтуль з бярэмем сена ішоў Тодар Мацьвеенка, а за ім, памахваючы пугаю, Адам Шаўцоў.

— Што ты маё сена крадзеш?—расхваляваны Базыль зьвярнуўся да Тодара.

— Чалавеча, адумайся! Я краду тваё сена?..

— Ты думаеш, што я ня бачыў як ты браў маё сена?

— Ну, браток, дрэнна ты бачыш! Раю табе акуляры надзець, мо тады лепей будзеш бачыць.

Адам Шаўцоў сталў побач і сьмяяўся. Яму было сьмешна: Тодар на яго вачох браў сена з свайго стога, а Касьцючэнка кажа, што сена яго. Але спрэчка паміж Базылём і Тодарам зайшла далёка: яны ўжо цягаліся за чубы.

— Пясі сена назад!—крычаў Касьцючэнка.

— Не панясу—сена маё.

— Пясі кажу!

— Не панясу.

— Не панясеш?

— Не панясу!

Касьцючэнка мігам убег у хату і вярнуўся адтуль са стрэльбай. Панёўшы стрэльбу на Тодара, ён крычаў:

— Пясі сена да стога, а то я цябе зараз пачастую.

Мацьвеенка сена ня пёс, бо ён браў сваё сена. У іх спрэчку ўмяшаўся Адам Шаўцоў, які стаяў у баку і наглядаў на «спрытнасьць» Базыля Касьцючэнка:

— Чаго ты скачаш на чалавека, як жаба на купіну? Апусьці ты сваю стрэльбу, пойдзем да стагоў і прыраўнаем гэта сена да твайго, а тады ўбачым, ці ён браў тваё сена.

— Пойдзем, згадзіўся Касьцючэнка.

— Пойдзем,—сказаў Тодар.

Тодар і Адам пайшлі наперад, а Базыль са стрэльбай ззаду.

— Вось я табе зараз дакажу: краў я тваё сена ці не,—сказаў Тодар, азірнуўшыся назад,—устыдаўся-б ты нападаць на нявінных людзей!

— Бу-у-ух!—пракацілася на балоце.

Адам Шаўцоў азірнуўся назад і ўбачыў забітага на сьмерць Тодара Мацьвеенку.

Гомельскі акруговы суд прыгаварыў забойцу Базыля Касьцючэнка на 8 год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем. Касьцючэнка падаў касацыйную скаргу ў Вярхоўны суд, які пакінуў прыгавар Гомельскага суду ў моцы.

**С. Азерскі.**

## СУДОВАЯ ХРОНІКА.

### ЗАКАПАЛА ДЗІЦЯ Ў ГНОЙ.

Дзяўчына вёскі Дулебы, Бярэзінскага р., Марфа Буніч, нарадзіўшы дзіця, занесла яго ў хлеў, дзе закапала живым у гной, ад чаго яно і задушылася. Выязная сэсія Менскага акруговага суду прыгаварыла Марфу Буніч на восем год зьняволеньня, але, прымаючы пад увагу яе цяжкае матар'яльнае становішча, скарацила пакараньне да 4 год залічыўшы кару ўмоўнай.

### ЗАБОЙСТВА НА ХРЭСЬБІНАХ.

У грамадз. вёскі Руднае, Халапеніцкага райёну, Сяргея Наталевіча, на хрэсьбінах было шмат гасьцей. Самагонка лілася ракой. Урэшце, п'яныя госьці распачалі бойку, у часе якой Міхась Рабцэвіч пажом прапароў бок брату гаспадара Нічыпару Наталевічу, ад чаго той на другі дзень памёр. Выязная сэсія Менскага акруговага суду прыгаварыла Міхася Рабцэвіча на тры гады і 4 месяцы зьняволеньня з суровым адмежаваньням.

### ЗА РАСТРАТУ І ПАДЛОГ.

Упаўнаважаны вучастковай страхкасы на ст. Барысаве Ігнат Цітавец прысвоіў і растраціў 49 р. 33 к., якія падлягалі выдачы пэнсыянэрам Лаўкету і Якубоўскай. Каб захаваць сьляды растраты, Цітавец падрабіў уласныя подпісы памянёных пэнсыянэраў. Выязная сэсія акруговага суду прыгаварыла Ігната Цітаўца на 6 месяцаў зьняволеньня.

### ЗА ГРАБЯЖЫ.

Вярхоўны Суд пакінуў у моцы прыгавор Гомельскага акруговага суду па справе І. Місачэнка, прыгаворанага на 10 год зьняволеньня, Т. Харлана—на 5 год, Л. Собка—на 8 год, К. Рымко, С. Харлана і А. Блашчанка—па 3 гады і П. Каваленка—на 2 гады зьняволеньня з суровым адмежаваньнем за шэраг бандыцкіх налётаў і абрабаваньняў у раёне г. Рэчыцы.

# Рознае.

### МЕРКУРЫ ЛАД СОНЦАМ.

10-га лістапада ў Ленінградзе будуць наглядаць рэдкае зьявішча: плянэта Меркуры будзе праходзіць над сонцам. На сонцы будзе рэзка вызначацца паўзучая чорная плямa.

### КРУГОМ СЬВЕТУ НА ЦЭПЕЛІНЕ.

У Фрыдрыхсгафэне (Нямеччына) будуецца аграмадны цэпелін, які будзе самым большым за ўсе пабудаваныя да гэтага часу. Гэты цэпелін зробіць палёт з 40 пасажырамі кругом зямной кулі.

### ЗЯЛЕЗНАЯ РУДА НА МУРМАНЕ.

На Мурмане выяўлены багатыя залежы зялезнай руды. У складзе яе каля 40 процантаў чыстага зялеза. У некаторых месцах магнітныя зелязьнікі выходзяць проста на паверхню зямлі.

### ШКЛЯНЫ НЕБАСКРОБ.

Адзін амэрыканскі міліярдэр прыпіў праэт нью-ёрскага архітэктара Більма Людзёва і даверыў яму пабудову вялізнага небаскробу, скаструіраванага выключна з зялезнага рыштаваньня і шкла. Да пабудовы такога дому багачэй схіліла меркаваньні, што даходы ад сьветавой рэклямы, умешчанай на шкляных сьценах, зусім пакрыюць выдаткі на пабудову гэтага гмаху.

### ЯШЧЭ АДЗІН СЬМЕЛЬЧАК.

Нядаўна мы пісалі, што францускі капітан Том Драке адзін адбывае падарожжа вакол сьвету. Цяпер Гуго Кона, немец, прыляцеў з Ам